№ 18 (472) 19 траўня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



WWW.SVABODA.ORG

# Стратэгія Расеі, беларускі адказ

У сьвятле апошніх падзеяў. Старонкі 4—7.

**Аляксандар Рар: «Доўгатэрміновая стратэгія мае на мэце аб'яднаць Расею і Беларусь у адзіную дзяржаву»**

Супрацоўнік Нямецкай рады замежнай палітыкі Аляксандар Рар камэнтуе для «НН» апошнія павароты ў беларуска-расейскіх адносінах. **Старонка 7.**

## У НУМАРЫ

**Мухі й катлеты ў адной талерцы**

Лукашэнку ў гэтай сытуацыі ня трэба рабіць анічога. Піша Віталь Тарас. **Старонка 8.**

**Танк incognitus**

Вялікія беларускія паэты эпохі камунізму ўсё яшчэ чакаюць бесстароньняга перачытаньня і бясстрашнае інтэрпрэтацыі. Піша Аляксандар Фядута. **Старонка 18.**

**Гонар апэратара БТ**

«Здароў, Дзянісе. Выдатная ідэя пра наркотыкі й порна. Студэнты журфаку на Акрэсьціна цябе ніколі не забудуцца», — SMS такога зьместу стала прычынай для судовага разьбіральніцтва. **Старонка 11.**

**Пабачыў сьвет «Інтымны дзёньнік» Багдановіча**

Агляд кніжных навінак. **Старонка 20.**

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 15.**



# У нумары

## камэнтары

Чаму Пуцін ня спыніць датацый, хоць і даручае зрабіць выгляд ............... 4

Спачатку — рубель ...... 6

Аляксандар Рар: «Доўгатэрміновая стратэгія мае на мэце аб'яднаць Расею і Беларусь у адзіную дзяржаву» ........................ 7

Віталь Тарас. Мухі й катлеты ў адной талерцы ............................ 8

Аляксандар Класкоўскі. Крумкач крумкачу вока ня выдзеўбе .................. 16

## люстра дзён

Упартыя факты ............ 10

Гонар апэратара БТ ... 11

Судзьдзі Тупік пагражалі ...................... 11

Сурвілла наведвае Аўстралію ...................... 12

Беластоцкую «Ніву» апраўдалі ....................... 12

Вольга Корбут: Бел–чырвона–белы сьцяг — сапраўдны .... 12

Высьвячаны імаверны пераемнік айца

Надсана .......................... 13

100 чалавек нічога не прасілі ....................... 14

«Звон Свабоды» не крануты .................... 14

Няясныя рахункі Лукашэнкі... ................. 14

## левым вокам

Лёлік Ушкін. Глябальныя выклікі пяцігодкі ........................ 17

## культура

Аляксандар Фядута. Танк incognitus ............ 18

Пабачыў сьвет «Інтымны дзёньнік» Багдановіча ................... 20

Атлянтыда ў шумавіньні радыёхваляў ................. 20

«НОМ» зьняў беларусаў ...................... 21

Вершы на экспарт ....... 25

## хроніка

Павал Севярынец Лісты зь лесу: Шлях пілігрыма ........... 22

Хроніка рэпрэсій і супраціву за 9—15 траўня ........... 22

## наша страва

Шпарагі .......................... 26

## газэтка дзеткам

Лясная крыжаванка .... 28

## in memoriam

Вадзім Круталевіч. Да саракавінаў ............. 12

## калі б...

Малюнкі Лёліка Ушкіна ........................... 31

## Кіроўца, што развозіў вызваленых з Акрэсьціна й Жодзіна, патрабуе дапамогі

Віктар Савіцкі, кіроўца, што на ўласным транспарце развозіў людзей, якіх выпускалі з Акрэсьціна й Жодзіна ў сакавіку–красавіку, 28 красавіка трапіў у цяжкую аварыю. Ён дагэтуль знаходзіцца ў рэанімацыі. Дактары прагназуюць доўгі пэрыяд лекаваньня і рэабілітацыі. Курс рэабілітацыі дарагі, да таго ж, у чалавека сям'я, малыя дзеці. Зьвяртаемся з просьбай да ўсіх, каму ён дапамагаў, да ўсіх людзей добрай волі з просьбай пра ахвяраваньні.

Р/р 3819382101009, 275 аддзяленьне, філіял 500 АСБ «Беларусбанк», код 601 УНН 100603596. Раковіч Вользе Ўладзімераўне. З пазнакай «ахвяраваньне».

**Просім усіх, хто мае магчымасьць, перадрукаваць гэтае паведамленьне.**

КАЛЁНКА РЭДАКЦЫІ

# Рост цэнаў на газ можа быць выгадны Беларусі

Тэму для аналізу гэтага нумару «НН» дала зьмена тону ў беларуска-расейскіх адносінах. Праўда, ніякага рэальнага павароту за ёю пакуль няма — пра гэта поўныя горычы назіраньні Віталя Тараса на **старонцы 8**.

На сустрэчы з Ільлём Клябанавым кіраўнік Беларусі заявіў, што Беларусь і Расея «застануцца сябрамі, па якой бы цане нам газ ні прадавалі». Гэта можна разумець як свайго роду капітуляцыю — гарантыі, што Беларусь будзе верная сваім васальным абавязкам, але ў той жа час і цьвёрдае «не» на прапановы «паглыбленьня інтэграцыі».

Маскву такі стан цалкам задавальняе, піша Аляксандар Класкоўскі (**старонка 16**). Чаму? «У адносінах да Беларусі Расея мае кароткатэрміновую і доўгатэрміновую стратэгію», — кажа нямецкі палітоляг Аляксандар Рар (**старонка 7**). Доўгатэрміновая стратэгія мае на мэце ўзьяднаць Расею і Беларусь у адзіную дзяржаву. Але кіраўніцтва Расеі ўсьведамляе, што ў бліжэйшы час гэта наўрад ці магчыма. Таму робіць стаўку на кароткатэрміновую стратэгію — змусіць Беларусь на дробныя саступкі, карыстаючыся тым, што А.Лукашэнка пазбавіў краіну поля для манэўру, і разьлічваючы аднойчы, у зручны момант, зьдзейсьніць свае запаветныя мары.

Рост цэнаў на газ, зь якім Беларусь мусіць неўзабаве сутыкнуцца, гэта, на першы погляд, непрыемная навіна як для ўраду, так і для паспалітых грамадзянаў. У кароткатэрміновай пэрспэктыве яна прывядзе да зьніжэньня тэмпаў росту ВУП і ўсплёску беспрацоўя, што зробіць легітымнасьць беларускага сувэрэнітэту больш датклівай. Але сярэднетэрміновыя наступствы можна павярнуць на карысьць Беларусі — і яе гаспадаркі, і яе палітычнае клясы.

Беларусь транжырыла энэргію. Нізкія цэны таксама рабілі непатрэбнымі эканамічныя пераўтварэньні. Калі «Газпром» павысіць цэны, спасылка на форс-мажорныя абставіны, мабыць, дапаможа Лукашэнку мабілізаваць грамадзтва, каб яно ператрывала выдаткі адаптацыі і адшкадавала інвэстыцыі ў энэргазьберажэньне.

Рост цэнаў на энэрганосьбіты можа быць таксама выкарыстаны рознымі палітычнымі сіламі для разьвянчаньня ілюзій адносна Расеі ў тых, хто інтэграцыю падтрымліваў з мэркантыльных меркаваньняў, найперш т.зв. «балота».

Нарэшце, сытуацыя падштурхоўвае ўлады да пераадоленьня забабонаў адносна кантактаў з Захадам, а апазыцыю — з Масквой. Тэарэтычна, адкрываецца прастора новых магчымасьцяў, якія можна выкарыстоўваць з розным вынікам. Як іх бачаць беларускія палітыкі і палітолягі і ці могуць яны быць выкарыстаныя практычна — **старонка 5**.

у кнігарнях з 15 траўня




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# Чаму Пуцін ня спыніць датацый, хоць і даручае зрабіць выгляд

Зьліў інфармацыі ў «Коммерсанте», доўгатэрміновая і кароткатэрміновая стратэгіі Расеі ў Беларусі, тактыкі А.Лукашэнкі і А.Мілінкевіча ў адказ — аналізуюць **Андрэй Казакевіч, Аляксандар Рар, Валеры Дашкевіч, Міхаіл Чыгір, Юры Карэтнікаў, Алесь Чыгір і Андрэй Суздальцаў**.

Расейская газэта «КоммерсантЪ» паведаміла пра даручэньне Пуціна «прыняць вычарпальныя меры» з мэтай спыненьня любога прамога ці ўскоснага датаваньня Расеяй эканомікі Беларусі, а таксама прыпыненьня рээкспарту або кантрабанды любых расейскіх тавараў празь Беларусь. Для выкананьня гэтых задачаў патрэбна правесьці рэвізію ўсяго масіву дамоўна-праўных дакумэнтаў, што рэглямэнтуць расейска-беларускія гандлёва-эканамічныя адносіны, і ўнесьці прапановы пра перагляд і зьмены з мэтай пераходу ў сувязях зь Менскам «на прынцыпы рэальнай карысьці і сапраўднага раўнапраўя».

Гэтая інфармацыя прайшла на тле падрыхтоўкі да саміту «Вялікай восемкі». Яна выклікала вялікі рэзананс у беларускіх недзяржаўных СМІ, але беларуская дзяржаўная прэса абышла гэтую публікацыю поўным маўчаньнем.

Беларускія аналітыкі сустрэлі інфармацыю «Коммерсанта» з доляй скептыцызму. «Арганізаваная ўцечка інфармацыі выклікала пэўны недавер», — піша тыднёвік «Белорусы и рынок».

Карэспандэнт «НН» задаў розным па сваіх поглядах палітыкам, эканамістам і палітолягам пытаньні: як яны трактуюць публікацыю «Коммерсанта», што б яны параілі рабіць у гэтай сытуацыі А.Лукашэнку і апазыцыі? Адказваюць Міхаіл Чыгір, былы прэм'ер-міністар, які цяпер адышоў ад палітыкі і кантактаў з апазыцыяй, незалежны беларускі палітоляг Андрэй Казакевіч, Валеры Дашкевіч, доктар эканамічных навук, які пэўны час супрацоўнічаў зь Белгазпрамбанкам», Алесь Чыгір, дэпутат Бабруйскага гарсавету, адзін зь лідэраў новай хвалі апазыцыі, Юры Карэтнікаў, моладзевы лідэр — каардынатар Інтэрнэт-суполкі «Правы альянс», ды Андрэй Суздальцаў — палітоляг, які працуе на пракрамлёўскія аналітычныя інстытуты.

**«НН»: Як Вы трактуеце заявы Расеі: гэта праява новай палітыкі ў дачыненьні да суседзяў па СНД ці крокі напярэрадні саміту G8?**

**Алесь Чыгір:** Пакуль гэта выглядае толькі рэклямным ходам напярэдадні саміту. У абодвух рэжымаў шмат супольнага, і Пуцін зусім не зацікаўлены ў тым, каб у нас адбыўся крызіс. Бакі знойдуць, як паразумецца — напрыклад, беларускі бок атрымае кампэнсацыйныя крэдыты і падвысіць кошты на транзыт альбо за ўтрыманьне расейскіх вайсковых аб'ектаў.

> Андрэй Суздальцаў: Варыянты, калі ў выніку падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты Лукашэнка альбо здае Беларусь, альбо ідзе на Захад, немагчымыя.

**«НН»: Спадар Суздальцаў, на Віленскім форуме інтэлектуалаў 3 траўня Вы заявілі, што мэта Расеі — не далучэньне Беларусі. А што ж тады за мэта? Атрымліваць больш грошай за газ? Прадэманстраваць сілу? Захаваць твар перад самітам?**

**Андрэй Суздальцаў:** Яшчэ раз падкрэсьлю, усе размовы пра паглынаньне Беларусі Расеяй — гэта параноя апазыцыйнай аналітыкі. Варыянты разьвіцьця падзеяў, калі ў выніку падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты Лукашэнка альбо здае Беларусь, альбо ідзе на Захад, альбо цярпіць крах у выніку сацыяльна-эканамічнага крызісу (рэвалюцыя), не вытрымліваюць крытыкі. Пагроза далучэньня Беларусі да Расеі, якую актыўна прагназуе апазыцыя, толькі падвысіла б Лукашэнку рэйтынг — як адзінаму, хто можа не дапусьціць такога варыянту. Ня будзе аншлюсу. Расея сама адкрывае межы, зь цяжкасьцю, але прабіваецца ў СГА, што прынясе ёй інвэстыцыі карпарацыяў, чые фонды ў дзясяткі разоў перавышаюць беларускі бюджэт. Ну ня будзе ж Пуцін будаваць тут аграгарадкі ці чысьціць сажалкі. Сувэрэнітэт каштуе немалых грошай, а ў гэтым выпадку Расея мерыцца спагнаць іх акурат зь Беларусі. Гэта сьведчыць пра стаўленьне яе да Беларусі як да незалежнай дзяржавы.

За апошнія гады ў Маскве, не бяз высілкаў афіцыйнага Менску, нарадзіўся міт пра Беларусь як пра нейкага эўрапейскага эканамічнага тыгра. 15 год Расея рабіла істотныя ўнёскі ў беларускую эканоміку і, у адрозьненьне ад Украіны, гэта дало плён — рост эканамічных паказьнікаў, стабільнасьць сацыяльнай палітыкі. Падчас перамоваў па пытаньнях коштаў на энэрганосьбіты расейскі бок яшчэ раз упэўніўся ў тым, што беларуская эканоміка гатовая да пераходу на якасна новы ўзровень узаемадачыненьняў, і можна ўрэшце спыняць яе датаваньне. Нюанс: на адным з этапаў перамоваў старшыня Нацыянальнага банку Беларусі Пятро Пракаповіч засьведчыў, што посьпехаў у эканоміцы беларусы дасягнулі ня толькі і ня столькі дзякуючы нізкім коштам на паліва, а ў выніку прадуманай эканамічнай палітыкі, што беларуская эканоміка гатовая да любых паваротаў, у тым ліку і да павышэньня коштаў на энэрганосьбіты. І тут зьяўляюцца

прадстаўнікі «Белтрансгазу» і пачынаюць прасіць нейкія падачкі. Гэты кантраст і падштурхнуў расейцаў да рашучых дзеяньняў.

**«НН»: Што мае рабіць апазыцыя ў такой сытуацыі? Ці варта ёй працягваць прагматычныя спробы наладжваньня кантактаў з Масквой?**

**Алесь Чыгір:** Збольшага наш экспарт арыентаваны на расейскі рынак, гэтак ёсьць цяпер і часткова будзе і пасьля Лукашэнкі. Таму будаваць нармальныя ўзважаныя адносіны з Масквой трэба ў любым разе. Перад выбарамі А.Мілінкевіч у часе візытаў у Маскву прадэманстраваў, што беларуская дэмакратычная апазыцыя гатовая да паўнавартасных адкрытых стасункаў з Расеяй, з улікам, зразумела, нацыянальных інтарэсаў абодвух бакоў. І гэтую лінію апазыцыі варта працягваць.

Валер Дашкевіч: Пры цане на газ 100—110 даляраў дзяржаве давядзецца адмовіцца ад шэрагу сацыяльных праграмаў.

**Юры Карэтнікаў:** Я цалкам згодны з Аляксандрам Мілінкевічам, які, назваўшы ўсё сваімі імёнамі, заявіў, што ніколі ня пойдзе на аншлюс. Думаю, цяпер акурат тая нагода, каб, адкінуўшы ўласныя амбіцыі, аб'яднацца вакол лідэра і дзейнічаць супольна.

**Андрэй Суздальцаў:** Цікава было б, калі б інтэлектуальныя высілкі апазыцыі, замест беспадстаўнага ляманту пра анэксію, былі скіраваныя на стварэньне энэргетычнага інтэграцыйнага праекту, своеасаблівага энэргетычнага мосту паміж Захадам і Ўсходам, што б зацікавіла і Эўропу і Расею.

**Андрэй Казакевіч:** Зрабіць нешта ў такім разе складана. Апазыцыя мусіць актыўна распаўсюджваць інфармацыю пра ролю сёньняшняй улады ва ўзьнікненьні гэтай сытуацыі: чаму наша эканоміка непадрыхтаваная да падаражаньня газу і г.д.

**Міхаіл Чыгір:** Апазыцыя ня мае сур'ёзных вагароў уплыву на сытуацыю, яе ўдзел —назіраньне за падзеямі.

**«НН»: Ці падрыхтаваная беларуская эканоміка да пераходу на эўрапейскія кошты на энэрганосьбіты?**

**Валеры Дашкевіч:** Абсалютна непадрыхтаваная. Той час, калі беларуская эканоміка мела заўважны прырост за кошт палітычных цэнаў на энэрганосьбіты, калі можна і трэба было рабіць укладаньні ў аднаўленьне прамысловасьці, страчаны. Грошы ішлі не туды, куды трэба. Нават цана 100—110 даляраў прывядзе да таго, што дзьве трацiны прадпрыемстваў стануць нерэнтабэльнымі. Альбо давядзецца адмовіцца ад шэрагу сацыяльных праграмаў.

**«НН»: Расейскія СМІ цьвердзяць, што па ўнутрырасейскіх коштах Беларусь зможа атрымліваць паліва, толькі зрабіўшыся «расейскай тэрыторыяй». Наколькі рэальнай Вы ацэньваеце пагрозу для сувэрэнітэту Беларусі цяпер, спадар Карэтнікаў?**

**Юры Карэтнікаў:** Гэта пачатак паўзучай акупацыі Беларусі, якая стала магчымая праз бязглуздую палітыку ўлады. Лукашэнка загнаны ў кут сваімі ж інтэграцыйнымі абяцаньнямі.

**«НН»: Што б Вы параілі А.Лукашэнку і ўраду рабіць у гэтай сытуацыі?**

**Валер Дашкевіч:** Будуць цяжкія перамовы. «Газпром» мае свае слабыя месцы, напрыклад, беларускі бок у выпадку нягнуткасьці расейцаў можа адмовіцца ад падаўжэньня кантракту на транзыт, паставіўшы пад удар Літву і Калінінградзкую вобласьць Расеі. Магчыма, бакі пагодзяцца на нейкі прымальны варыянт, кшталту 80—90 даляраў цягам 2—3 гадоў, што Расея дасьць нам на адаптацыю да сусьветных цэнаў. Калі ж дасягнуць такіх умоваў ня ўдасца, ураду давядзецца пераглядзець усю сацыяльна-эканамічную палітыку: давядзецца зьмяняць падатковую палітыку, збанкрутаваць нерэнтабэльныя энэргазатратныя прадпрыемствы, а адсюль непазьбежным будзе значнае падвышэньне ўзроўню беспрацоўя. Яно ў сваю чаргу прымусіць зьмяніць стаўленьне да малога і сярэдняга бізнэсу.

Нас чакаюць меры рынкавага характару пад жорсткім ціскам улады. Беларусам варта рыхтавацца да таго, што іхныя заробкі больш ня будуць так расьці, як раней, бо ў сытуацыі, што складваецца, рабіць гэта будзе вельмі складана. Урад можа быць адпраўлены ў адстаўку. Практыка апошніх 12-ці год паказвае, што найвышэйшае кіраўніцтва краіны, як правіла, не бярэ на сябе адказнасьць за правалы ў эканамічнай палітыцы.

**Андрэй Суздальцаў:** У тым, што так склалася, вінаваты ня толькі Лукашэнка. У Маскве добра вядомае стаўленьне беларускай намэнклятуры, выхаванай у рэчышчы савецкіх традыцыяў, да Расеі — урваць сваё і тут жа забыцца на абяцаньні, дадзеныя ў часе чарговых дамоваў-перамоваў. Дзеяньні Лукашэнкі мусяць быць празрыстымі і шчырымі. Хочаш быць незалежным — плаці па сусьветных коштах. І лепей, як па мне, Беларусь пачне плаціць па гэтых коштах яшчэ за Лукашэнкам, які ўсе гэтыя гады карыстаўся расейскімі ільготамі. Мусіць распачацца аб'ектыўны і прагматычны дыялёг пра энэргетычную інтэграцыю.

Андрэй Казакевіч: Лукашэнка мусіць весьці вельмі ўзважаныя перамовы, каб мінімізаваць эканамічныя наступствы пераходу на новыя цэны.

**Міхаіл Чыгір:** Паводле маіх разьлікаў, Беларусь у выніку гэтага падвышэньня штогод вымушаная будзе даплачваць 2,5—3 млрд даляраў. Трэба скарачаць нерэнтабэльныя прадпрыемствы, мадэрнізаваць прамысловасьць, укараняючы энэргазьберагальныя тэхналёгіі. Мусім навучыцца эканоміць.

**Андрэй Казакевіч:** Масква перасьледуе як геапалітычныя інтарэсы, так і ўнутраныя эканамічныя. І апошні чыньнік відавочна пераважае — там ёсьць свой бюджэт і свой народ, якому таксама трэба плаціць заробак. А чаму б не за кошт таго, што ідзе ў Беларусь? Лукашэнка мусіць весьці вельмі ўзважаныя перамовы, каб мінімізаваць эканамічныя наступствы пераходу на новыя цэны. Наша эканоміка надта залежная ад далейшага разьвіцьця сытуацыі.

**Запісаў Сямён Печанко**

**Аляксандар Рар: «Доўгатэрміновая стратэгія мае на мэце аб'яднаць Расею і Беларусь у адзіную дзяржаву»**

Супрацоўнік Нямецкай рады замежнай палітыкі **Аляксандар Рар** камэнтуе для «НН» апошнія павароты ў беларуска-расейскіх адносінах. **Старонка 7.**

# Спачатку — рубель

Што пра эканамічны шантаж Беларусі піша расейская прэса?

Газэта **«КоммерсантЪ»** са спасылкамі на свае крыніцы ў расейскім урадзе надрукавала 12 траўня матэрыял, у якім сьцьвярджаецца, нібыта Ўладзімер Пуцін падпісаў даручэньне спыніць субсыдыяваньне беларускай эканомікі з разьлікам на тое, што ў Аляксандра Лукашэнкі не застанецца выйсьця з сыстэмнага эканамічнага крызісу, і ён сам папросіцца ў Расею.

«КоммерсантЪ» піша, што Масква рыхтуецца да шырокамаштабнага націску на Менск: на газавым, нафтавым, электрычным, хімічным (калійным), мэталапракатным, харчовым і іншых накірунках. Вынікам яго мусіць стаць стварэньне адзінай дзяржавы на ўмовах Масквы. На газавым кірунку Расея настойвае на кантролі «Газпрому» над беларускімі газаправодамі. Пры гэтым афіцыйна ўжо некалькі разоў пацьверджана, што цана на газ у наступным годзе для Беларусі вырасьце ў кожным разе.

Згодна з інфармацыяй «Коммерсанта», Пуцін загадаў «прыняць вычарпальныя меры» з мэтай спыненьня датацыяў Расеяй беларускай эканомікі, а таксама рээкспарту й кантрабанды расейскіх тавараў (перадусім энэрганосьбітаў) праз тэрыторыю краіны. І — галоўнае — правесьці рэвізію ўсіх дамоваў, што рэглямэнтуюць расейска-беларускія адносіны.

Пра тое самае паведамляюць у аўторак **«Новые известия»**: «Над прэзыдэнтам Беларусі зноў згушчаюцца хмары. Узмацняецца ціск з боку Масквы, што пагражае падвысіць цану на газ і спыніць субсыдыяваньне беларускай эканомікі… Цэнтральныя расейскія СМІ апошнімі днямі разгарнулі цэлую піяр-кампанію на тэму спыненьня фінансавых і іншых уліваньняў у беларускую эканоміку. У Менску ж гэтыя сыгналы заўважаць не жадаюць. Ня выключана, што пры страце расейскай падтрымкі Лукашэнка можа зьвярнуцца да рыторыкі нацыянальнай апазыцыі. Маўляў, абаронім наш сувэрэнітэт ад імпэрскай Расеі!»

Больш за ўсё Расея губляе на г.зв. «схаванай» форме рээкспарту праз экспарт нафтапрадуктаў у Беларусі. Беларусь ня сплачвае экспартных мытаў пры пастаўках нафты (у адрозьненьне ад расейскіх заводаў), а нафтапрадукты прадаюцца па эўрапейскіх цэнах. Атрымліваецца, што губляе расейскі бюджэт, а беларускі, наадварот, напаўняецца. Агулам Беларусь экспартуе 13 млн тон нафтапрадуктаў у год, сярод якіх каля 60% прыпадае на даччыныя структуры расейскіх кампаніяў, якім таксама выгадна гэтая схема, паведамляе «КоммерсантЪ».

«З павышэньнем цэнаў на газ і спыненьнем субсыдыяваньня нафтавага экспарту, — робіць вывад «КоммерсантЪ», — Масква нанясе па А.Лукашэнку сур'ёзны палітычны ўдар, і Менск альбо будзе вымушаны пайсьці на ўмовы Масквы, альбо апынецца перад пагрозай моцных эканамічных і сацыяльных ператрусаў». А словамі крыніцы газэты ў Крамлі, «адзіны спосаб для Беларусі атрымліваць газ па ўнутрырасейскіх цэнах — гэта ўваход у склад Расеі».

«Беларусь у канструктыўным ключы папярэдзілі, што мы будзем выходзіць на стандартныя ўмовы паставак газу», — цытуе расейскі **«Інтэрфакс»** свайго суразмоўцу «з расейскіх урадавых колаў», які падкрэсьлівае, што «разьлік за газ было б весьці нашмат прасьцей, калі б у Беларусі й Расеі існавала адзіная валюта».

Менш канкрэтна, але ня менш жорстка выказаў афіцыйную пазыцыю «Газпрому» для радыё **«Эхо Москвы»** прэс-сакратар кампаніі Сяргей Купрыянаў: «Нам трэба зразумець, якія крокі ў гэтым годзе Беларусь зробіць для «Газпрому» што да здавальненьня нашых эканамічных патрэбаў».

**«Время новостей»** падкрэсьлівае, што «прапанова «Газпрому» не знайшла належнага водгуку ў Менску, які згодны толькі на 11-адсоткавую індэксацыю газавых цэнаў. А калі ўлічыць, што намесьнік старшыні праўленьня «Газпрому» Аляксандар Разанаў прапанаваў распачаць размову пра пераход на эўрапейскі ўзровень цэнаў для Беларусі са 150 даляраў за тыс. кубоў (у тры разы больш, чым цяпер), дык прапановы Менску выглядаюць як зьдзек».

А газэта **«Ведомости»** ў аўторак піша, што для самой Расеі нізкія цэны на энэрганосьбіты могуць стацца вялікай праблемай, бо «Эўракамісія прапанавала СГА лічыць унутраныя цэны на энэрганосьбіты для расейскіх вытворцаў забароненай субсыдыяй». І настойваць на іх павелічэньні пад пагрозай недалучэньня Расеі да Сусьветнай гандлёвай арганізацыі. У гэтым годзе для расейскіх кампаніяў газ каштуе $43,12 за 1000 м$^3$, а кантрактная цана для Эўропы — каля $250.

Тымчасам **«Газета»** паведамляе пра вялікі міжнародны скандал, зьвязаны са схемай спажываньня газу Ўкраінай, што канчаткова перакрывае магчымасьць ажыцьцяўленьня аналягічнага сцэнару ў дачыненьні да Беларусі (гэта калі «Газпром» набывае газ фактычна ў сябе самога й перапрадае ва Ўкраіну па меншых цэнах, але валодае транзытам цэнтральнаазіяцкага газу). Мін'юст ЗША шукае валадароў паловы акцыяў кампаніі «РосУкрЭнерга», зарэгістраванага ў Швайцарыі, паведамляе «Газета» (другая палова належыць «Газпрому»). Гэта могуць быць маскоўскія чыноўнікі, піша выданьне.

Нарэшце, газэта **«Бизнес»** 16 траўня аналізуе: «Газпром» атрымаў ад Беларусі права адмовіцца ад будаўніцтва Паўночна-Эўрапейскага газаправоду на карысьць другой чаргі газаправоду «Ямал—Эўропа», пад які ў Беларусі нібыта ўжо адведзеная зямля. На самай справе аптымізм Беларусі аднабаковы: «Ніякіх рашэньняў што да будаўніцтва другой чаргі газаправоду «Ямал—Эўропа» не прынята, больш за тое, перамовы нават і не распачыналіся», — заявіў газэце прэс-сакратар «Газпрому» Сяргей Купрыянаў.

**Зьміцер Дрыгайла, Масква**

# Аляксандар Рар: «Доўгатэрміновая стратэгія мае на мэце аб’яднаць Расею і Беларусь у адзіную дзяржаву»

Супрацоўнік Нямецкай рады замежнай палітыкі **Аляксандар Рар** камэнтуе для «НН» апошнія павароты ў беларуска-расейскіх адносінах. **Старонка 7.**



**«НН»: Што хаваецца за патрабаваньнем Расеі да Беларусі расплачвацца ў наступным годзе за газ паводле новых, значна падвышаных цэнаў?**

**Аляксандар Рар:** У адносінах да Беларусі Расея мае кароткатэрміновую і доўгатэрміновую стратэгію. Доўгатэрміновая стратэгія мае на мэце аб’яднаць Расею і Беларусь у адзіную дзяржаву. Заўважу: ня проста стварыць саюзную дзяржаву, а забясьпечыць «узьяднаньне». Але кіраўніцтва Расеі ўсьведамляе, што ў бліжэйшы час гэта наўрад ці магчыма зьдзейсьніць. Таму робяць стаўку на кароткатэрміновую стратэгію — змусіць Беларусь пайсьці на як мага больш шчыльнае саюзнае супрацоўніцтва, найперш у эканамічных справах.

Аднак адначасова ствараецца ўражаньне, што Лукашэнка вядзе падвойную гульню ў адносінах да Расеі (дарэчы, падобна да таго, як сама Расея вядзе падвойную гульню ў адносінах да Захаду). Напрыклад, Лукашэнка жадае, каб Расея давала яму патрэбную абароненасьць ад NATO, каб падтрымлівала яго на міжнароднай арэне ў канфліктах з Захадам, але зь іншага боку — рэзка адмаўляецца ўводзіць адзіную валюту, бо ведае, што ў выніку гэтага ён згубіць магчымасьць самастойна вызначаць эканамічную палітыку ў краіне. Расеі гэта ўсё менш і менш падабаецца. Праз падвышэньне цэнаў на газ яна хоча даслаць Беларусі зразумелы сыгнал: ці вы крок за крокам становіцеся на шлях палітыкі аб’яднаньня і ў выніку гэтага атрымліваеце права карыстацца ўсімі выгодамі адзінай эканамічнай прасторы, ці крочыце сваім шляхам, як Украіна. Тады вы павінны плаціць іншыя грошы за энэрганосьбіты.

**«НН»: Гэта ня першы «газавы» канфлікт паміж Расеяй ды Беларусьсю. Ці дамажацца гэтым разам Крэмль сваіх мэтаў?**

**АР:** Калі ў першы раз Расея адключыла Беларусі газ, вялося пра прыватызацыю беларускіх нафтаправодаў. Тады Беларусь была змушаная пайсьці ў «патрэбным» кірунку, і цяпер практычна згубіла кантроль над нафтаправодамі. «Слаўнафта» была падпарадкаваная інтарэсам «Сібнафты», і ў выніку гэтага расейскі ўплыў у Беларусі значна ўзмацніўся. І калі Расея сапраўды пажадае змусіць Беларусь гуляць па «ўкраінскіх» правілах, то ёй гэта ўдасца.

**«НН»: Эўразьвяз рыхтуецца замарозіць рахункі, зьвязаныя зь беларускім рэжымам, ЗША стварылі ўласны сьпіс «неўязных» беларусіх чыноўнікаў і іх родных. Ці выпадковы такі сынхронны ціск на Лукашэнку і з Захаду і з Усходу?**

**АР:** І той і іншы бок жадаюць паўплываюць на сытуацыю ў Беларусі пасьля выбараў, абодва маюць свае пазыцыі, таму і дзейнічаюць адпаведна.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі, Бэрлін**

# Басовішча–2006:
## Што? Дзе? Калі?

Сёлетні фэстываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча» будзе ўжо 17-м па ліку і пройдзе **21—22 ліпеня.** Пэрыяд актыўнай падрыхтоўкі да сьвята рок-музыкі пад адкрытым небам распачаты! Вось асноўныя даты ў падрыхтоўцы фэстывалю:

**28 траўня**

Да гэтай даты **прымаюцца дэма-запісы ад зацікаўленых гуртоў.** Найлепшыя трапяць на адборачны канцэрт.

**11 чэрвеня**

Да гэтай даты будзе вызначана, хто едзе на «Басовішча-2006» у якасьці канкурсантаў, а таксама гасьцей фэстывалю і запрошаных зорак. Большасьць канкурсанаў абярэ журы падчас адборачнага канцэрту. Яшчэ адзін гурт абяруць інтэрнэт-галасаваньнем на сайце «Тузін Гітоў».

**1 ліпеня**

Вызначэньне гуртоў-удзельнікаў «Вольнай сцэны». Гэта пляцоўка на «Басовішчы» для тых, хто не бярэ ўдзелу ў конкурснай праграме. Каб трапіць туды, гурты мусяць даслаць свой дэма-запіс арганізатарам да 1 ліпеня.

**Заяўка**

ад гурту на ўдзел у конкурснай праграме «Басовішча» мусіць уключаць **запіс адной (ці болей) песень па-беларуску на CD-носьбіце.** Яшчэ **абавязковай ўмовай зьяўляецца** наяўнасьць 20-хвіліннай музычнай праграмы па-беларуску. Таксама музыкі-ўдзельнікі на момант правядзеньня адборачнага канцэрту мусяць мець у пашпартох **штампікі з дазволам на выезд за мяжу.**

Адрэсу для дасылкі дэма-запісаў можна даведацца, патэлефанаваўшы па нумарох: 6855239 ці 2646974.

Уся падрабязная інфармацыя пра «Басовішча-2006» рэгулярна зьяўляецца на сайце **www.stu-denty.by.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Мухі й катлеты ў адной талерцы

Лукашэнку ў гэтай сытуацыі ня трэба рабіць анічога. Піша **Віталь Тарас.**




**Антыпуцінская агітацыя падчас расейскіх прэзыдэнцкіх выбараў-2004.**

Журналісты, у тым ліку аналітыкі (калі гэты падвід яшчэ захаваўся ў Беларусі), павінны быць удзячныя Ўладзімеру Пуціну. За шчырасьць. Вядома, былых супрацоўнікаў КГБ, ФСБ ды ўсіх іншых спэцслужбаў не бывае паводле азначэньня. Яны прызвычаіліся заўсёды працаваць у змроку і да скону дзён захоўваюць вернасьць службовай таямніцы. Пуцін — жывое пацьверджаньне гэтай аксіёмы. Тым ня менш, часам прэзыдэнт Расеі дазваляе сабе казаць проста і адкрыта некаторыя рэчы — напрыклад, пра ўзаемадачыненьні зь Беларусьсю. Ягоная фраза наконт «мух» і «катлет» пасьпела зрабіцца хрэстаматыйнай.

Аднак некаторыя айчынныя аналітыкі (назавём гэтую катэгорыю людзей так) усё ж палічылі за лепшае трактаваць гэты выраз выключна як узор расейскага прыгожага маўленьня. Яны схіляліся да думкі, што Пуціну, відаць, больш даспадобы мадэль Эўрапейскага Зьвязу, чым Савецкі Саюз. Ён, маўляў, больш схільны да заходняй дэмакратыі, чым усходніх дэспатыяў і таталітарызму.

## Дагнаць і перагнаць ЗША!

Для тых, хто дагэтуль яшчэ нечага не зразумеў, расейскі прэзыдэнт паўтарыў сваю пазыцыю ў сваім пасланьні нацыі 10 траўня. Беларусь ён узгадаў у сваім выступе ўсяго аднойчы — у пляне неабходнасьці далей мацаваць дружбу й супрацоўніцтва. Словаў пра «саюзную дзяржаву» ў пасланьні няма зусім. Тым ня менш, агульная танальнасьць, патас і галоўнае — сэнс пасланьня не павінны ні ў кога пакідаць ніякіх сумневаў у характары замежнай палітыкі Крамля — у тым ліку, што да Беларусі.

Расея ў выступе свайго прэзыдэнта ня проста пазыцыянуе сябе як краіна, якая процістаіць Захаду. Яна ня проста ставіць на мэце дагнаць і перагнаць Захад у ваенных адносінах (калі ня ў колькасных, дык у якасных) паказьніках. Цяжка ўстрымацца, каб ня ўспомніць тут вядомую расейскую байку пра слана... Але, насамрэч, справа выглядае вельмі сур'ёзнай. Расея паводзіць сябе ня так, быццам яна хоча стаць супэрдзяржавай. Яна паводзіць сябе так, быццам яна ўжо ёсьць такой дзяржавай, імпэрыяй, якая можа пагражаць Эўропе ды ўсяму сьвету. Ня атамнай зброяй, дык газам. Расейская газэта «КоммерсантЪ» трапна назвала гэта «ваенным капіталізмам».

Калі спробы адкрытага дыктату й шантажу выходзяць на першае месца ў дачыненьнях Расеі з заходнімі краінамі, дык што тады казаць аб яе стасунках з краінамі СНД? Тут ня трэба хадзіць далёка за прыкладам — дастаткова ўспомніць нядаўнія падрывы газаправодаў на мяжы Расеі з Грузіяй, забарону на ўвоз грузінскіх вінаў і мінэральнай вады «Баржомі», аналягічныя захады стасоўна вінаў Малдовы.

У адрозьненьне ад свайго беларускага партнэра, Пуцін у сваіх выступах не імправізуе. Ягонае пасланьне нацыі, да прыкладу, сёлета перараблялася двойчы, паводле ягоных уласных настаяньняў. Але расейскі прэзыдэнт заўсёды гаворыць тое, што ад яго хочуць пачуць, чаго чакаюць, аб чым мараць падначаленыя.

Вядомы расейскі пісьменьнік і журналіст Адяксандар Кабакоў, які ў нядаўнім мінулым лічыўся прагрэсіўным вальнадумцам, напісаў на адным з Інтэрнэт-сайтаў, што няма такой краіны, як Грузія. Паколькі эканамічны патэнцыял Грузіі непараўнальна малы побач з патэнцыялам Расеі, значыць, гэтая краіна ня мае права называцца краінай і чагосьці там патрабаваць ад Масквы — раўнапраўя, павагі, далікатнасьці. Падобныя аргумэнты наконт перавагі эканамічнага патэнцыялу Расеі не аднойчы гучэлі, дарэчы, і ў дачыненьні да Беларусі, пры тым на вельмі высокім дзяржаўным узроўні.

## «Есьць кантакт?» — «Будзем есьць кантакт!»

У гэтым выпадку мы маем справу з развагамі інтэлігентнага чалавека, ці, прынамсі, чалавека, які ўважае сябе за расейскага інтэлігента. І такія настроі, трэба прызнаць, пануюць сёньня ў самых шырокіх слаях расейскага грамадзтва. Ніводзін расейскі тэлеканал, ніводнае буйное выданьне не ўступілася сёлетняй вясной за ахвяраў палітычных рэпрэсіяў у Беларусі. І не таму, што ўсе расейскія журналісты задушаныя цэнзурай. Большасьць іх піша паводле

«веления сердца». Паглядзіце, колькі іроніі ўкладае вядоўца інфармацыйнай праграмы, калі распавядае пра намаганьні грузінскага кіраўніцтва вырашыць праблему экспарту віна ці аб няпростых перамовах украінскіх палітыкаў у справе стварэньня парлямэнцкай кааліцыі. З такой самай іроніяй вядоўцы распавядаюць і пра нейкую сьмешную беларускую «апазыцыю», якая не вядома чаго хоча.

Затое колькі захапленьня ў паведамленьнях пра чарговы запуск ракетаў «Тополь-М»!

Было б памылкай сьцьвярджаць, быццам расейскія журналісты капіююць беларускіх калегаў альбо вучацца ў іх прыслужлівасьці. Тут дзейнічаюць больш агульныя законы, паводле якіх будуюцца і разьвіваюцца аўтарытарныя сыстэмы. Як бы ні грэбаваў Пуцін кантактамі з Лукашэнкам, зь якой бы іроніяй ні ставіўся да свайго калегі, ён сьлед у сьлед паўтарае ўсе ягоныя дзеяньні, скіраваныя на згортваньне дэмакратыі, грамадзянскае супольнасьці, законнасьці.

Толькі ў адрозьненьне ад сучаснай Беларусі ў Расеі ёсьць куды больш моцны ідэалягічны падмурак для адбудовы імпэрыі. Гэта расейская праваслаўная ідэя, якая налічвае тысячу гадоў і якую Масква нікому не саступіць.

## Абяззброены Захад

Мала хто ўсур’ёз успрыняў нядаўнюю праваслаўную канфэрэнцыю ў Маскве, на якой царкоўныя герархі фактычна абвясьцілі анафэму самому паняцьцю «правы чалавека». Яны былі названыя нікчэмным спараджэньнем Захаду, якое расчышчае дарогу бездухоўнасьці й сэксуальнай распусьце. Абаронцы такіх сярэднявечных падыходаў зь ліку афіцыйных палітыкаў і прыдворных журналістаў тлумачылі падобнага роду заявы ўсяго толькі неабходнасьцю карэкціроўкі «некрытычнага захапленьня заходнімі каштоўнасьцямі» і важнасьці самастойнага курсу Расеі.

«Карэкціроўка» курсу выявілася ў далейшым ціску на недзяржаўныя праваабарончыя арганізацыі, незалежныя мэдыі ды ўзмацненьні антызаходніцкай прапагандысцкай рыторыкі. Асаблівую ятру выклікалі заявы амэрыканскага віцэ-прэзыдэнта Чэйні пра адсутнасьць дэмакратыі ў Расеі. (Хоць, здавалася, чаго абурацца, калі дэмакратыя супярэчыць расейскім духоўным каштоўнасьцям?)

У выступе кіраўніка расейскай дзяржавы няма згадак пра рост расізму ды ксэнафобіі, усё больш адкрытыя праявы фашызму, а таксама пра здушэньне свабоды слова. Усё гэта, як вынікае з агульнага зьместу пасланьня, унутраныя справы Расеі, у якія Захад ня мае права ўмешвацца. Такім чынам, быў дадзены «асымэтрычны адказ» на асьцярожныя памкненьні Захаду націснуць на Пуціна, каб ён паспрыяў дэмакратызацыі Беларусі. Гэта прыкладна тое самае, калі б ЗША падчас халоднай вайны спрабавалі б ціснуць на Савецкі Саюз, каб ён паспрыяў, напрыклад, зьмякчэньню рэжыму Чаўшэску ў Румыніі.

Захад, прынамсі Заходняя Эўропа, сапраўды цяпер бязьмежна зацікаўлены ў захаваньні трывалых паставак расейскага газу. Бліскучы прыклад — дамова аб пабудове газаправоду па дне Балтыйскага мора. У гэтай галіне Захад даўно быў гатовы паступіцца прынцыпамі. Крытыкуючы парушэньні правоў чалавека ў Беларусі, Захад схільны быў не заўважаць такіх самых парушэньняў у Расеі. Адзінае, на што апошнім часам спадзяваліся заходнія краіны, — гэта захаваць свой твар хаця б да саміту G8 у Санкт-Пецярбургу.

## Проста застацца

Аднак Пуцін у сваім пасланьні адкінуў маску вонкавай прыстойнасьці і сам назваў рэчы сваімі імёнамі. Ніякія заходнія рэформы Расеі больш не патрэбныя. Яна сама вырашыла несьці свае каштоўнасьці ўсяму сьвету й дамінаваць на ўсёй постсавецкай прасторы. Краіны Захаду апынуліся тым самым у двухсэнсоўным становішчы. Пуцін і зь іх сарваў маскі. Ім ужо не да лёсу дэмакратыі і незалежнасьці ў Беларусі. На карту пастаўленыя іх уласныя сувэрэнныя правы — напрыклад, права адстойваць свае дэмакратычныя прынцыпы.

Усьлед за Лукашэнкам, Пуцін кінуў Захаду цывілізацыйны выклік. Выклік Лукашэнкі ён доўгі час не заўважаў, потым — дазволіў сабе пахітаць пальчыкам «апошняму дыктатару» Эўропы. Нават не прызнаў апошнія прэзыдэнцкімі выбары легітымнымі. У дачыненьнях жа да Расеі заходнія краіны ня могуць сябе так паводзіць. У сытуацыі адкрытай канфрантацыі Ўсходу і Захаду крытыка Беларусі адсоўваецца, у лепшым выпадку, на задні плян.

Што гэта азначае для Беларусі і яе кіраўніцтва? З аднаго боку, Лукашэнка можа, нібыта, уздыхнуць з палёгкай. Пытаньне аб легітымнасьці апошніх прэзыдэнцкіх выбараў і магчымых санкцыях Захаду ў дачыненьні да беларускага рэжыму робіцца неактуальным. Але ж Лукашэнка трапляе, што называецца, з агню ў полымя. Распараджэньне Пуціна аб пазбаўленьні Беларусі эканамічных прэфэрэнцыяў нясе ёй куды большую пагрозу, чым мітычныя заходнія санкцыі. Незалежна ад таго, пацьвердзіцца інфармацыя газэты «КоммерсантЪ» аб сакрэтным распараджэньні Пуціна альбо не, Расея, калі зыходзіць са зьместу ягонага пасланьня, больш ня мае намеру гуляцца ў раўнапраўныя адносіны з былымі савецкімі рэспублікамі.

Наўрад ці яна набярэцца сілаў і нахабства пайсьці на аншлюс Беларусі. (Нават у дачыненьні да слабой Грузіі Масква не рашаецца на варыянт акупацыі, баючыся рэакцыі сусьветнай супольнасьці і асабліва «таварыша ваўка».) Але ў гэтым і няма патрэбы. Беларусь сёньня задавальняе Маскву як сувэрэнны суб’ект міжнароднага права, які ў той самы час застаецца верным яе васалам, «малодшым братам» у барацьбе з Захадам.

Лукашэнку ў гэтай сытуацыі ня трэба рабіць анічога. Адзінае, што ад яго патрабуецца, — проста заставацца самім сабой. Заставацца там, дзе ён ёсьць (а не спрабаваць гуляць на расейскім палітычным полі), і займацца тым, чым ён займаўся дагэтуль — здушэньнем дэмакратычнай апазыцыі, а таксама змаганьнем з усімі праявамі нацыянальнай сьвядомасьці. Наўзамен яму будзе дазволена называцца ў Крамлі «нашым сучым сынам» і заставацца ва ўладзе так доўга, як ён таго захоча. Кошты на газ пры гэтым — самая маленькая цана, якую толькі можна сабе ўявіць.

## Замест постскрыптуму

Твар расейскага прэзыдэнта, які даўно ўжо зрабіўся звыклым, дзякуючы тэлеэкрану, ад нейкага часу дзіўным чынам пачаў здавацца яшчэ больш знаёмым. Быццам я недзе сустракаў гэтага чалавека ў натоўпе. А нядаўна ўспомніў. Такія самыя твары, дакладна з такім самым выразам, давялося не аднойчы бачыць на вуліцах Менску падчас вулічных акцыяў блізу Кастрычніцкай плошчы ці на Акрэсьціна. Невыразныя, безаблічныя, можна сказаць, яны ня кідаюцца ў вочы. Але заўсёды сьцятыя нянавісьцю губы і ваўчыны, «сьвідруючы» позірк лепей за службовае пасьведчаньне выдаюць у іх уладальніках чэкістаў.

# Упартыя факты

## Ці дазваляецца падначаленым афіцэра Падабеда маніць?

10 красавіка актывістка Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ Аўгіньня Багінская падала заяву на імя пракурора Цэнтральнага раёну Менску Аляксандра Хадатовіча, у якой зьвярнула ўвагу на недапушчальныя дзеяньні супрацоўніка палка міліцыі спэцыяльнага назначэньня (ПМСН).

7 красавіка падчас акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы міліцыянт у форме вырваў з рук сп.Багінскай, немаладой ужо жанчыны, бел-чырвона-белы сьцяг, зламаўшы пры гэтым вудутронак, і перадаў яго калегу ў цывільным. Той кінуў сьцяг у сьметніцу. У сваёй заяве Аўгіньня Багінская зазначае, што ніхто ня можа забараніць шанаваць нацыянальныя сымбалі, а бел-чырвона-белы сьцяг і ёсьць такім сымбалем, бо дадзены беларусам гісторыяй.

Спн.Багінская запатрабавала знайсьці і пакараць асобу, якая зьняважыла яе нацыянальную годнасьць, а таксама спагнаць зь віноўнага грошы. Сымбалічныя — у памеры кошту вуды.

Пракуратура Цэнтральнага раёну, разгледзеўшы заяву, перадала яе камандзіру ПМСН ГУУС Менгарвыканкаму Юр'ю Падабеду. 27 красавіка сп. Аўгіньня атрымала адказ ад камандзіра менскага спэцназу, у якім той адзначыў, што «службовая праверка не пацьвердзіла датычнасьць супрацоўнікаў ПМСН да фактаў, выкладзеных у заяве грамадзянкі Багінскай».

Між тым А.Багінскай перадалі фатаздымак, зроблены 7 красавіка. У чалавеку ў цывільным, які кідае ў сьметніцу нацыянальны сьцяг, аўтары фота пазналі супрацоўніка ПМСН Шашко Івана (па-расейску Шешко).

Гэта, дарэчы, той самы чалавек, што затрымаў галоўнага рэдактара «Нашай Нівы» 21 сакавіка і пасьля сьведчыў у судзе, нібыта А.Дынько нецэнзурна лаяўся і на шматразовыя заўвагі не рэагаваў. Гэтае сьведчаньне выклікала ня проста сумневы ў праўдзівасьці, але і немалое абурэньне ўсіх, хто ведае галоўнага рэдактара «НН».

## Што для байцоў ПМСН вышэйшае: карпаратыўная этыка ці закон?

Таму пытаньні ў гр.Багінскай застаюцца. І зьяўляюцца новыя, ужо да самога палкоўніка Ю.Падабеда. Ці не кіруюцца афіцэры падразьдзяленьня прынцыпам «мэта апраўдвае сродкі»? І ці не культывуецца ў выніку гэтага ў ПМСН нянавісьць да ўсяго беларускага і неабавязковасьць у дачыненьні да закону? Што для байцоў ПМСН вышэйшае — карпаратыўная этыка ці закон? І да чаго ўсё гэта можа давесьці падначаленых Ю.Падабеда?

Пэнсіянэрка А.Багінская зьбіраецца падаць яшчэ адну заяву ў пракуратуру, прыклаўшы фатаграфію і заявы сьведкаў.

**Сямён Печанко**



**Іван Шашко выкідае ў сьметніцу сьцяг з паламаным тронкам. 7 красавіка.**



МВД Республики Беларусь

№ МГ/35 – 503
27.04.06

Багинской А.Н.
проживающей по адресу:
г.Минск ул. Я.Коласа,36-8

Сообщаю, что по Вашему заявлению в прокуратуру Ценрального района г. Минска, в ПМСН ГУВД Мингорисполкома проведена служебная проверка в ходе которой установлено, что сотрудники ПМСН ГУВД Мингорисполкома к фактам указанным в Вашем заявлении отношения не имеют.

С уважением, –

Командир ПМСН
ГУВД Мингорисполкома Ю.Н. Подобед



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Дзяніс Бальшакоў (зьлева) здымае суд над Фінькевічам.**

# Гонар апэратара БТ

«Здароў, Дзянісе. Выдатная ідэя пра наркотыкі й порна. Студэнты журфаку на Акрэсьціна цябе ніколі не забудуцца», — SMS такога зьместу стаў прычынай для судовага разьбіральніцтва.

Адразу пасьля разгону намётавага гарадка ў Інтэрнэце зьявілася інфармацыя, што кадры з порначасопісамі й шпрыцамі прыдумаў і зьняў апэратар БТ Дзяніс Бальшакоў, студэнт-трэцякурсьнік факультэту журналісткі БДУ. Падаваўся й нумар мабільнага тэлефона Бальшакова з прапановай заваліць яго эсэмэскамі ды званкамі з выказваньнем шчырага «фэ». Некаторыя з студэнтаў журфаку выказалі сваю агіду ў твар апэратару БТ: гэтых студэнтаў пачалі выклікаць у дэканат факультэту «на размову».

Бальшакова завалілі пасланьнямі й тэлефанаваньнямі. У адказ ён падаў у суд — у абарону свайго гонару і годнасьці. Паводле зьвестак «НН», маюць адбыцца прынамсі тры падобныя працэсы. Суд супраць Алесі Сіўчыкавай быў прызначаны на 15 траўня, але потым яго перанесьлі: адказчыца не зьявілася. Працэс адбудзецца 18 траўня а 16-й гадзіне ў судзе Ленінскага раёну Менску (вул.Сямашкі, 3).

**АШ**

# Судзьдзі Тупік пагражалі

15 суткамі арышту Ленінскі суд Менску пакараў 30-гадовага тэхнічнага рэдактара «Беллітфонду» Паўла Лоскутава.

Судзьдзі Веры Тупік 26 сакавіка а 1-й гадзіне начы затэлефанаваў невядомы мужчына, які назваўся прадстаўніком нейкага «Народнага судзілішча» й пагражаў унясеньнем у «чорны сьпіс» за прысуды, вынесеныя дэмакратычным актывістам. Sim-карта мабільнага тэлефону, зь якога тэлефанавалі судзьдзі, як высьветлілася, належала N. Дзяўчына паінфармавала, што карту перадавала свайму сябру Паўлу Лоскутаву. На падставе гэтага факту Паўла зьвінавацілі ў пагрозах работніку суду. П.Лоскутаву не дапамагла заява, што sim-карта была страчаная да званка.

Пакуль дайшло да судовага працэсу, справу пасьпелі перакваліфікаваць з крымінальнай у адміністрацыйную. Доказы таго, што тэлефанаваў Лоскутаў, былі толькі ўскосныя: ані запісу званка, ані ўласна sim-карты абвінавачаньне ня мела.

У судовай пастанове запісана, што хаця П.Лоскутаў сваёй віны не прызнаў, аднак яна цалкам пацьвярджаецца матэрыяламі справы: заявай судзьдзі Тупік пра пагрозы ёй і зафіксаванымі званкамі зь sim-карты.

Застаецца дадаць, што хулігана П.Лоскутава нядаўна прынялі ў Саюз беларускіх пісьменьнікаў як маладога паэта.

**Аркадзь Шанскі**

# Сурвілла наведвае Аўстралію

Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла і яе намесьнік Сяргей Навумчык нанесьлі візыт у Аўстралію.

У Сыднэі І.Сурвіллу прывітаў старшыня Беларускага грамадзка-культурнага клюбу Міхась Лужынскі. У будынку клюбу адбылася сустрэча зь беларусамі Сыднэю.

Івонка Сурвілла наведала Сыднэйскі ўнівэрсытэт — найбольшую навучальную ўстанову Аўстраліі. Прафэсар Вольга Качан расказала пра навуковыя праграмы ўнівэрсытэту, дзе, дарэчы, захоўваецца калекцыя беларускіх пэрыядычных выданьняў.

Пасьля Сыднэю І.Сурвілла накіравалася ў Мэльбурн, які доўгі час лічыўся цэнтрам беларускага жыцьця ў Аўстраліі. Старшыня Рады БНР наведала набажэнства ў царкве Трох Віленскіх Пакутнікаў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, сустрэлася зь сябрамі парафіяльнай рады. Кіраўнік Фэдэральнай рады беларускіх арганізацыяў у Аўстраліі Яўген Груша наладзіў прыём, на якім прысутнічалі і лідэры беларускіх арганізацыяў штату Вікторыя. На ім удзельнікі вакальнай групы «Каліна» прэзэнтавалі свае песьні, выдадзеныя на CD.

Івонка Сурвілла наведала беларускія могілкі ў Фоўкнэры, дзе ў 1970-я гады ўстаноўлены помнік «На вечны ўспамін спачылых усіх ведамых і няведамых беларусаў».

У аўторак старшыня Рады БНР вылецела ў Адэляйду, дзе таксама сустрэнецца зь беларусамі.

**Паводле радыё «Свабода»**

# Беластоцкую «Ніву» апраўдалі

15 траўня ў Беластоцкім райсудзе быў зачытаны вырак праграмнай радзе штотыднёвіка «Ніва». Нарэшце ў гэтай справе, якая цягнулася з 2003 году, пастаўлена кропка. Судзьдзя раённага суду Беластоку Кшыштаф Казлоўскі прызнаў 11 чалавек рады на чале з прафэсарам Яўгенам Мірановічам невінаватымі. Нагадаем, што праграмная рада «Нівы» абвінавачвалася ў наўмысным скажэньні інфармацыі пра наклад і выдаткі тыднёвіка з мэтай атрыманьня дзяржаўных датацый.

Судзьдзя Казлоўскі прызнаў, што супрацоўнікі «Нівы» прынесьлі нашмат болей грамадзкай карысьці, абараняючы правы беларускай меншасьці, чым магчымай шкоды, выкліканай зборшага бюракратычнымі затрымкамі ў працэсе атрыманьня датацыяў у Міністэрстве культуры і недахопам досьведу ў бухгальтарскай справаздачнасьці.

На паседжаньні суду прысутнічала прадстаўнічая дэлегацыя зь Беларусі на чале зь лідэрам дэмакратычнай апазыцыі Аляксандрам Мілінкевічам і старшынёй рады Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» Аленай Макоўскай.

Пасьля судовага паседжаньня Мілінкевіч выехаў у рэдакцыю беластоцкага беларускамоўнага радыё «Рацыя» і выступіў у жывым этэры на FM.

**Алесь Аркуш, Беласток**

# Вольга Корбут: бел-чырвона-белы сьцяг — сапраўдны

Сайт вядомай гімнасткі Вольгі Корбут, якая жыве цяпер у ЗША, паказвае нашую зямлячку як шчырую беларуску: яна не забылася патлумачыць амэрыканцам, што многія дарма думаюць, нібы яна расейка. І далей ідзе кароткі расповед пра Беларусь. У гэтым жа разьдзеле (http://www.olgakorbut.com/belarus.htm) патлумачаная розьніца паміж лукашэнкаўскім і нацыянальным сьцягам. Бел-чырвона-белы названы сапраўдным (this is the real flag of Belarus), а чырвона-зялёны — афіцыйным (at the official), які, «на жаль», падмяніў сапраўдны.

**АВ**

## IN MEMORIAM

### Вадзім Круталевіч. На саракавіны

Пра яго сьмерць не паведамілі ані «Звязда», ані «Советская Белоруссия», ані іншыя прыўладныя газэты. А ён жа быў удзельнікам вайны, застаўся без рукі, у апазыцыйныя арганізацыі не ўваходзіў... Не заўважылі сыходу чалавека, які пакінуў адметны сьлед у гістарычнай навуцы. Дый сярод гісторыкаў не знайшлося каму згадаць добрым прылюдным словам калегу.

Зрэшты, ён быў юрыстам, доктарам юрыдычных навук. І як спэцыяліст у галіне дзяржавы і права адной ступіў на ніву гісторыі БССР. Калі ён пачаў публікаваць свае — як на той час, сэнсацыйныя — артыкулы, ад яго адвярнулася нават тая, каго ён кахаў. Але ён паказаў сябе вучоным і працягваў сваю справу.

Я ніколі не сустракаў яго. Але гутарыў зь ім і спрачаўся. Спрачаюся і сёньня. Нават не называючы ягонае імя. У нас розныя канцэпцыі. Яму чагосьці не хапіла, каб прызнаць пачаткам нашае дзяржаўнасьці Беларускую Народную Рэспубліку. Але ён дастаткова ясна паказаў тым, хто ўваходзіў у самастойнае жыцьцё ў другой палове 1960-х, што БССР не была вынікам добрае волі бальшавікоў. У аснове падыходу бальшавікоў да беларускага пытаньня было што заўгодна (нацыянальны нігілізм, імпэрскі цэнтралізм, цынічны разьлік...), але толькі не марксізм і не рэзалюцыя Лёнданскага кангрэсу Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу (1896) аб праве нацыяў на самавызначэньне.

Калі на момант забыцца пра пазьнейшыя адрозьненьні і разыходжаньні, трэба прызнаць: усе, хто цяпер займаецца вытокамі беларускае дзяржаўнасьці XX ст., ня могуць абмінуць ягоных працаў, а многія маюць права назваць яго калі не сваім настаўнікам, дык непасрэдным папярэднікам.

18 траўня спаўняецца 40 дзён, як Вадзім Круталевіч пакінуў нас. У гэты дзень спамянём яго добрым словам. Няхай родная зямля будзе яму пухам.

**Анатоль Сідарэвіч**

14 траўня ў Лёндане ўкраінскі біскуп рукапаклаў на дыякана 28-гадовага грэка-каталіка Сяргея Стасевіча.

# Высьвячаны імаверны пераемнік айца Надсана

14 траўня ў Лёндане быў высьвячаны на дыякана Сяргей Стасевіч — гадунец папскай Грэцкай калегіі ў Рыме і былы супрацоўнік выдавецтва «Pro Christo».

Урачыстыя абрады распачаліся днём раней, падчас адведваньня Беларускай каталіцкай місіі ў паўночным Лёндане Паўлам Хамныцкім OSBM, біскупам Стэмфардзкім (Украінская каталіцкая царква ў ЗША). Біскупа Паўла сардэчна прывітаў а.Аляксандар Надсан — апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў у замежжы. У звароце да прысутных а.Надсан зазначыў, што надыходзячыя сьвятарскія пасьвячэньні Сяргея Стасевіча — гэта асабліва радасная і важная падзея, чакаць якой у Лёндане давялося 25 гадоў. У беларускай царкве Сьв.Пятра і Паўла Сяргей Стасевіч атрымаў ад біскупа Паўла пасьвячэньні ў чытальніка і субдыякана.

У нядзелю 14 траўня ў лёнданскай украінскай катэдры Сьвятое Сям'і на Выгнаньні біскуп Хамныцкі ўзначаліў прынагодную сьвятую літургію, удзел у якой узяў таксама а.Надсан, а пэўныя часткі набажэнства гучалі па-беларуску. У часе гэтай літургіі біскуп Павал рукапаклаў Сяргея Стасевіча на дыякана. У звароце да вернікаў Украінскай катэдры і шматлікіх гасьцей зь беларускай грамады біскуп Павал сказаў, што ўкраінская царква працягнула руку братняй дапамогі беларускім грэка-каталікам, якія дагэтуль ня маюць уласнага біскупа ані ў Беларусі, ані ў замежжы. Ён павіншаваў айца дыякана Стасевіча са сьвячэньнямі і дадаў, што наступнымі крокамі стануць высьвячэньне дыякана Стасевіча на прэзьбітара — а некалі, магчыма, і на біскупа — для духоўнага служэньня беларусам у замежжы і на Бацькаўшчыне.



**Момант рукапакладаньня. Справа — айцец Надсан, зьлева — біскуп Хамныцкі.**

Пасьля набажэнства айца дыякана Сяргея Стасевіча ды а.Аляксандра Надсана на прыступках катэдры сустракала і шчыра віншавала беларуская грамада. Беларусы Вялікабрытаніі сардэчна дзякавалі біскупу Паўлу за яго разуменьне духоўных патрэбаў беларусаў і чынную дапамогу. Высьвячэньне новага беларускага сьвятара ў Вялікабрытаніі — гэта падзея, духоўны сэнс якой сягае далёка па-за межы ўласна супольнасьці беларускіх каталікоў у гэтай краіне.

**Антон Запалота**



**Сяргей Стасевіч** нарадзіўся ў 1978 г. у Івацэвічах на Берасьцейшчыне. Падчас студыяў у БДУ далучыўся да Каталіцкай царквы ў парафіі Маці Божай Нястомнай Дапамогі ў Менску. Пры падтрымцы рэктара Беларускай каталіцкай місіі ў Лёндане айца Аляксандра Надсана ён быў прыняты ў Грэцкую калегію ў Рыме, дзе і праходзіў фармацыю да сьвятарства. Сяргей Стасевіч атрымаў ступень бакаляўра тэалёгіі ў папскім Унівэрсытэце сьвятога Тамаша Аквінскага «Анджэлікум» у 2004 г.

# 100 чалавек нічога не прасілі

У расейска- і ўкраінскамоўнай частцы Інтэрнэту была распаўсюджаная інфармацыя, што каля 100 прыхільнікаў беларускай апазыцыі, удзельнікаў сакавіцкіх пратэстаў, зьвярнуліся да Ўкраіны па палітычны прытулак. Гэтая інфармацыя, па зьвестках інтэрнэт-газэт, была агучаная на прэс-канфэрэнцыі ў Кіеве.

«НН» зьвярнулася па камэнтар да моладзевага актывіста Зьмітра Дашкевіча, які браў удзел у згаданай прэс-канфэрэнцыі. «Гэта правакацыя! Быў зварот да ўкраінскіх уладаў з просьбай даць магчымасьць беларускім студэнтам, выключаным з ВНУ, вучыцца ўва Ўкраіне. Нідзе не выкарыстоўвалася слова «прытулак». І лічба 100 чалавек таксама нідзе не называлася», — заявіў З.Дашкевіч. «Прасілі не прытулку для сабе, а каб украінскія ўлады дапамаглі працягнуць навучаньне выключаным за палітыку студэнтам», — удакладніў Вячаслаў Сіўчык, які таксама перабываў у Кіеве.

Блогер (аўтар дзёньніка, які вядзецца ў Інтэрнэце) Фольксваген выявіў, што навіну растыражавалі вядучыя прапуцінскія інтэрнэт-прапагандысты, такія, як regnum.ru, utro.ru, newsru. com, grani.ru і interfax.ru. «Усё ў стылі прапаганды КГБ-Паўлоўскага, — піша Фольксваген. — Завецца гэта лжывай асацыяцыяй. Да спасылкі, што хтосьці зьбег, ненавязьліва падвязваецца ідэйка, што драпаюць менавіта тыя, хто выступае… І пайшло, панялося па Інтэрнэце…»

**АШ**

Штодзённа абнаўляны беларускі блог вы знойдзеце па адрасе http://www.tolblogs.org/belarus/by/




АРЦЁМ ЛЯВА

## «Звон свабоды» не кранутыя

Звон Свабоды вярнулі аўтарам Алесю Шатэрніку і Алесю Марачкіну праз 51 дзень арышту. Сканфіскаваны ўначы з 20 на 21 сакавіка Звон вярнулі толькі пасьля таго, як прайшлі й Дзень Волі, і травеньскія сьвяты. У міліцыі Звон захоўваўся ў навучальнай клясе. Сьледчы з пробзьвішчам Камера, перш чым аддаць Звон, цікавіўся ў аўтараў, ці ня з крадзенай бронзы ён роблены ды на якія грошы.

Гэта цуд, што рука ніякага вандала не замахнулася на выбітны твор мастацтва.

**АВ**

## Няісныя рахункі Лукашэнкі і міністраў замарозяць

Газэта «Financial Times Deutschland» паведаміла, што Эўразьвяз рыхтуецца замарозіць замежныя рахункі А.Лукашэнкі ды яшчэ больш чым 30 беларускіх афіцыйных асобаў. Сярод іх міністар унутраных справаў, генпракурор, старшыня КДБ, сьпікер парлямэнту, кіраўнікі Адміністрацыі прэзыдэнта. Чакаецца, што канчатковае рашэньне ў гэтым пытаньні будзе прынятае 18 траўня.

У Адміністрацыі тым часам ізноў заявілі, што Лукашэнка рахункаў за мяжой ня мае.

**АШ**

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку
6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перsucceeded, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**
Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

### На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць. На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

# Шчыры дзякуй за ахвяраваньні

**Ірыне Ц., Мікалаю Р.** з Жыткавіцкага раёну.
**Сяргею Ч.** зь Ліды.
**Ігару Б., Зьмітру Ш.** зь Берасьця.
**А.Т., Ніне К., А.А.** з Горадні.
**Валер'ю С.** зь Пінску.
**Міхаілу С.** са Слуцку.
**Леаніду В.** з Лагойскага раёну.
**А.К., Пятру Ш.** з Навапалацку.
**Анатолю С., Любові В.** з Магілёва.
**Глебу С.** з Салігорску (два ахвяраваньні).
**Канстанціну Я.** з Жодзіна.
**А.А.** з Полацку.
**А.Т.** з Пружанскага раёну.
**Аляксандру Ш., Уладзімеру П.** з Аршанскага раёну.
**Ірыне В., Васілю Г.** зь Менскага раёну.
**Іне С.** з Барысава.
**Усяславу С.** з Баранавічаў.
**Ніне Б.** з Кобрынскага раёну.
**Арцёму Г.** зь Ліды.
**Міхаілу А.** зь Нясьвіжу.
**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Я.Ш., Сьвятлане Ц.** з Маладэчна.
**Міхаілу Т.** са Слуцку.
**Сяргею Д.** зь Лідзкага раёну.
**А.Б.** з Магілёва.
**Іраідзе З., Натальлі А., Ларысе Н., Мікалаю Ш., Віктару П., Паўлу Ц., Сяргею З., І.Г., Ірыне Г., Галіне В., Галіне Я., Леаніду Дз., Паўлюдзе А., Валянціне Ш., Юр'ю Г., Сьвятлане В., Аляксандру К., Алене К., Вадзіму М., Эдуарду К., Марату К., Віталю К., М.К., У.Б., Ларысе К., Алесю Р., Барысу Ш., Максіму К., В.К., Людміле П., А.Л., яшчэ аднаму А.Л., І.Л., Э.Н., Сяргею К., Надзеі П., Канстанціну З., Аляксею Л., Альбэрту Л., А.Р., Вікторыі Р., У.Л., К.М., А.С., Сяргею А., А.З., Уладзімеру Д., Юр'ю Ш., Аўгену Ш., Р.Б., Уладзімеру К., Н.Ж.** зь Менску.

АНОНС

## Літаратурны выпуск «НН»

**Чытайце ў наступным нумары:**

«Націск на зычныя». Вальжына Морт і Зьміцер Вішнёў пішуць і чытаюць вершы ў Бэрліне.

Франц Сіўко. «І наша сьвядомасьць цынічна маўчала». З новых запісаў.

«ССК-1». Апавяданьне Паўла Касьцюкевіча пра першага беларускага сьвін-скарбонку-касманаўта.

«Апокрыф зьняверaных». Даніла Жукоўскі — пра раман Алеся Наварыча «Літоўскі воўк».

Караткевіч і Карпюк. Два пракрокі ў сваёй Айчыне.

Вершы Готгальда Эфраіма Лесінга па-беларуску.

«Кветкі для паэта». Успамін пра адну сустрэчу з Рыгорам Барадуліным.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Крумкач крумкачу вока ня выдзеўбе



Няма падставаў верыць у сур'ёзнасьць эканамічнага шантажу Расеі. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Зьдзіўляе, зь якой лёгкасьцю энтузіясты пачынаюць хаваць рэжым кожны раз, калі Масква хмурыць бровы. Вось і цяпер пачалося. Маўляў, Лукашэнка для Крамля — ужо «адпрацаваны матэрыял». І як толькі там намацаюць «беларускага Януковіча», дык пачнуць прасоўваць яго, не чакаючы новых выбараў.

Між тым публікацыя ў «Коммерсанте» пра нібыта загад Пуціна скасаваць усе датацыі Беларусі надта нагадвае трывіяльны «зьліў», захад псыхалягічнае вайны.

Увогуле размовы пра тое, што Крэмль вырашыў нарэшце разабрацца зь менскім начальствам, сынусоідна актывізуюцца аж ад 2002 году, калі прагучала знакамітая фраза пра неабходнасьць адлучыць катлеты ад мух. Але ж і па сёньня ў двухбаковых стасунках — тая самая антысанітарыя.

Так, пэрыядычна расейцы палохаюць менскіх партнэраў, каб *«не слишком борзели»*. Змушаюць так-сяк разьлічвацца. Але ня болей.

Аншлюс малаімаверны — пры ўсім імпэрскім ачмурэньні пэўных колаў Расеі, падагрэтых ілюзіяй энэргетычнага дыктату. Хаўрусьнік, якому «няма куды падзецца з падводнае лодкі», болей каштоўны ды меней клопатны, чым як яшчэ адна праблемная (а неўзабаве — мяцежная) правінцыя. Менскі палітоляг Сяргей Панькоўскі кажа, што Беларусь-сатэлітка — «апошняя прыкмета імпэрскай ідэнтычнасьці Расеі».

Тутэйшае ж начальства і без пакручастых фармулёвак адчувае сытуацыю нутром. Таму выглядае спакойным, як сыты пітон. Днямі Лукашэнка зноў агучыў перад дэлегацыяй Паўночна-Заходняй акругі Расеі звыклы набор тэзаў. Маўляў, калі вы за інтэграцыю, то давайце роўныя ўмовы гаспадараньня (то бок газ — па смаленскіх тарыфах). Што да адзінага рубля, то дом не будуюць з даху (чытай: калі рак на гарэ сьвісьне). А сувэрэнітэт — гэта сьвятое.

І хто паспрачаецца?

Для Крамля сёньня пытаньне капіталізацыі «Газпрому» шмат актуальнейшае, чым аншлюс. Таму за трубу паваюць, але на разгойдваньне ўнутрыпалітычнае сытуацыі ў Беларусі напэўна ж ня пойдуць. Аб'ектыўна Маскве недарэчы як інкарпарацыя Беларусі, так і любая рэвалюцыя тут. Ня мела баба клопату!

Энэргетычнага шоку ня будзе, даводзіць наша эканамістка Алена Ракава. Яго здымуць цэнавы кампраміс, сустрэчны беларускі рахунак (базы, транзыт і інш.). А рэшту выдаткаў традыцыйна размажуць на ўсіх, так што гэта будзе ня надта заўважна ў рэчышчы звыклага паўзучага падаражэньня айчыннага кошыка тавараў ды паслуг.

Адпаведна выглядаюць надзвычай хісткімі разьлікі апазыцыі сабраць у свой кошык ураджай гронак народнага гневу.

Гаворка не пра тое, што справа дэмакратыі ў нас гіблая. Гаворка пра тое, што апазыцыйным стратэгам варта распрацоўваць веер варыянтаў. Каб потым ня чухаць патыліцу: ну вось, дзьве аўтакратыі зноў паразумеліся і сапсавалі нам плян элегантнае рэвалюцыйнай перамогі! І хто б мог падумаць, што крумкач крумкачу вока ня выдзеўбе?



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лукіскі верш-1937 і акрэсьцінская квецень-2006.**



МАКСІМ ТАНК

Паслухайце, вясна ідзе.
Зьвініць ў маім акне жалеза.
Зь вінтоўкай стражнік ноч і дзень
Пільнуе куст пахучы бэзу.

А ён расьцьвіў, агнём гарыць,
Такім пахучым, мяккім, сінім,
На дрот калючы, на муры,
Як хустку, полымя ускінуў.

Я ціха разбудзіў другіх.
Ад сьлёз сінелі вочы бэзам.
І недзе хруснула ў худых
Руках іржавае жалеза.

*1937*

# Глябальныя выклікі пяцігодкі



Дзясятка пагрозаў нацыянальнай бясьпецы. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

У 80-я, на піку гармоніі піпла і партыі, ролю «доктара зла» ў масавай культуры выконвалі тайфуны, бураны і няладная электраправодка. Сёньня Беларусь пераадолела ня толькі жахі, выкліканыя развалам СССР, але і нэгатыўныя праявы, характэрныя для савецкага часу, у выніку чаго валавы ўнутраны прадукт вырас у паўтара раза проці паказчыкаў 1990 году.

Тым ня менш, асобныя праблемы застаюцца. На мінулым тыдні рэдакцыя «НН» прысьвяціла адзіны палітдзень вызначэньню гэтых пагрозаў мэтадам статыстычнага аналізу публікацый «Савецкай Беларусіі».

На 10-м месцы аказалася пагроза палітычнага перавароту. Пра апазыцыю «СБ» пісала два разы мімаходзь, камэнтуючы ваяжы Лукашэнкі ў артыкулах пад характэрнай шапкай «У рытме добрага настрою».

Побач, на 9-м, пагроза міжнародных санкцыяў. Той жа мінімальны ўзровень асьвятленьня.

На 8-е месца вырваліся выпускнікі ВНУ, якія адмаўляюцца ехаць на месца разьмеркаваньня. Пагроза недахопу кадраў для сельскай гаспадаркі вымусіла ўзмацніць адказнасьць за нняўку на месца.

7-е месца заслужана трымаюць вырабнікі і прадаўцы палёнай гарэлкі. Яны пагражаюць рынку і здароўю нацыі.

6-е месца займаюць махляры, якія прапануюць працу на хаце і, атрымаўшы ад працаўнікоў папярэдні ўнёсак на арганізацыйныя выдаткі фірмы, бясьследна зьнікаюць. Ёсьць жа яшчэ дурні, якім працы хочацца. Нашто, здавалася б, калі кожны можа выйграць у «Наша лято»?

У аранжавай зоне пагрозы на 5-м месцы — беларускія мадэльеры, якія замест таго, каб арыентавацца на масавы рынак, выдумляюць нейкія экзатычныя фасоны кшталту «будзёнавец бяз плавак». Захаваецца гэткая тэндэнцыя — і наша тэкстыльная індустрыя ніколі ня выйдзе на сусьветны рынак.

Пагроза нацыянальнага значэньня і 4-е месца — уладальнікі шапікаў, што панаставілі лядоўняў, электрычныя кабэлі якіх б'юць токам пакупнікоў.

3-е месца — паляўнічыя, якія парушаюць 300-мэтровую зону вакол населеных пунктаў, дзе забаронена расчахляць зброю. Вядома, узброеныя людзі заўсягды небясьпечныя. Досыць прыгадаць стрэл пад Лёзна.

2-е месца — прагматычныя бізнэсоўцы, якія дзеля эканоміі не жадаюць ставіць у крамах ахоўную сыгналізацыю (між тым гэтая паслуга МУС каштуе ўсяго 200 баксаў у месяц) і такім чынам падстаўляюць пад нажы налётчыкаў свой пэрсанал. Вядома, як жа міліцыі ехаць на выклік, калі ёй загадзя не прабашляеш.

І, нарэшце, увага! СУПЭРПАГРОЗА! Прадавачкі сельскіх унівэрмагаў завышаюць цэны на катафоты для ровараў, чым выклікаюць рост колькасьці дарожна-транспартных здарэньняў у вёсках. Мы краіна транзытная, таму на нашых трасах ня можа панаваць хаос і анархія! Гэта пытаньне!

Карацей, пагрозаў сьвет. Аднак ня ўсё так блага. Гэтак, у траўні быў вынайдзены ідэальны сродак супраць беспрацоўя. Дзякуючы «Саўбелцы», кожны грамадзянін нашай краіны можа пацешыцца за сталічных беспрацоўных, якія цяпер штодня езьдзяць у калгас перабіраць бульбу. Той, хто выканае плян і перагледзіць 150 кг караняплодаў за сьвятлавы дзень, атрымлівае заробак — 10 кг, якія, па словах журналіста, можна ня толькі зьесьці, але і рэалізаваць на рынку. Чытаеш гэты матэрыял, і адчуваецца, што журналісты салíднай газэты і самі ня супраць атрымліваць у канцы месяца ня тры мільёны Br а тры мяхі сартавой, рассыпастай валюты.

# Танк incognitus

Вялікія беларускія паэты эпохі камунізму ўсё яшчэ чакаюць бесстароньняга перачытаньня і бясстрашнае інтэрпрэтацыі. Піша **Аляксандар Фядута.**

Вялікім беларускім паэтам эпохі камунізму — а Танк, як і Куляшоў, Панчанка, бессумнеўна, зь іх шэрагу — неабходна дачакацца таго часу, калі чытаць іх будуць менавіта як паэтаў — бяз гневу і староннасьці, упісваючы ў кантэкст сучаснай ім эўрапейскай і сусьветнай літаратуры. І, мажліва, гэты час хутка прыйдзе.

Але менавіта дзеля таго, каб такое ў прынцыпе магло стацца мажлівым, каб укладальнікі мелі рэальны шанец працаваць з усім паэтычным матэрыкам аўтарскіх тэкстаў, і патрэбны ПЗТ. Акадэмічная навука мусіць задаць пэўную сыстэму каардынатаў — эстэтычных, маральна-этычных, але галоўнае — гістарычных, у каторыя і будзе ўпісана творчасьць паэта.

Два першыя тамы ПЗТ Максіма Танка, не бяз шыку 1930-х гг. апранутыя ў колер хакі ды ў завяршэньне падабенства аздобленыя фотапартрэтамі маладога Танка — яшчэ пазбаўленага будучага намэнклятурнага лоску і сталай мудрасьці, з фанатычным бляскам у вачох, Танка, няўлоўна падобнага на беларускага тэрарыста №1 тае эпохі Сяргея Прытыцкага, — былі пакліканыя пракласьці шлях да стварэньня такой сыстэмы каардынатаў. Аднак гэтага не адбылося.

Не адбылося, бо беларускае акадэмічнае літаратуразнаўства так і не наважылася стаць літаратуразнаўствам у поўным значэньні гэтага слова. Чытачам пададзены вынік працы тэкстолягаў і эдытараў — ня болей. У звароце «Ад рэдкалегіі», што распачынае першы том ПЗТ, сарамліва сказана з гэтай нагоды: «Камэнтар абмяжоўваецца бібліяграфічна-тэксталягічнай характарыстыкай твораў, якая ўключае інфармацыю пра час напісаньня вершу, яго першапублікацыю і пра тое, паводле якой крыніцы падаецца асноўны тэкст. Тут жа прыводзяцца выяўленыя варыянты — паводле ўсіх публікацый, а таксама на аснове захаваных і расчытаных белавых і расшыфраваных чарнавых аўтографаў, даюцца зьвесткі пра месца знаходжаньня рукапісаў і г.д.».

Каб зразумець, пра што вядзецца, нагадаю чытачу (упішу ў кантэкст, калі ўжо сам заклікаю да гэтага калегаў), як рыхтаваўся першы «ўзорны» ПЗТ сталінскай эпохі — так званы Вялікі акадэмічны ПЗТ Пушкіна. Быў створаны адмысловы камітэт на чале з Максімам Горкім. Быў падрыхтаваны «пробны» том — том сёмы, што ўлучаў пушкінскую драматургію. Ён выйшаў малым накладам з камэнтарамі клясыкаў савецкага літаратуразнаўства — Рыгора Вінакура, Дзьмітрыя Якубовіча, іншых. Сталін гэты том прачытаў увесь, асабіста.

Высновы гэтага «вялікага навукоўца» былі адназначныя: Пушкіна афіцыйна забаранілі камэнтаваць. Камэнтары былі замененыя эдыцыйнымі даведкамі акурат паводле тае схемы, якую і прапаноўваюць удзячнаму чытачу сябры рэдкалегіі ПЗТ Максіма Танка. Праз 70 год пасьля Сталіна!

Сказаць, што Танк 1930-х — 1950-х гадоў, часу, што даўно стаў гісторыяй і патрабуе асэнсаваньня, не вымагае камэнтатарскай работы — відавочнае глупства! І рэдкалегія ПЗТ таго ня кажа (яны ж ня дурні). Але і не камэнтуе.



**Натальля Арсеньнева, якой сёньня зноў няма ў праграмах, і Максім Танк захапляліся паэзіяй адно аднаго. Вільня, 1936.**

Гэта зразумела. Возьмем эпіграмы Танка.

Іржа Іржавіч Эсэрман
Калісьці атрымаў ад бацькі
У спадчыну чырвоны бант
Са сьветапоглядам лайдацкім.
Ёсьць хлеб, соль, грошыкі ў яго,
Дыплём акадэмічны мае...
Але — для крытыка майго —
Яшчэ шмат клёпак не хапае.

Калі рэдактары тому ўпэўненыя ў тым, што школьны настаўнік, студэнт, любы некваліфікаваны чытач у стане што-кольвек зразумець з гэтага вершу, наважуся зь імі паспрачацца. І такіх вершаў, што пазбываюцца ўсялякага сэнсу па-за гістарычным кантэкстам, у першых двох тамох ПЗТ даволі багата.

Тое самае было і з Пушкіным. Але варта памятаць, што пасьля завяршэньня публікацыі ВАПЗТ Пушкіна паводле рашэньня прэзыдыюму АН СССР пачалі выходзіць адмысловыя выданьні: «Пушкин. Исследования и материалы» (з 1954 г.) і «Временник Пушкинской Комиссии» (з 1961 г.). Фактычна ў рэжыме штодзённай работы Пушкінская камісія АН СССР займалася вяртаньнем страчанага — камэнтаваньнем клясыка. І толькі дзякуючы гэтаму галоўны адрасат любой кнігі — чытач — атрымаў мажлівасьць зразумець, пра што пісаў Пушкін.

Ужо ў 1970-я, карыстаючы з паслабленьня цэнзурнага ціску, Інстытут расейскай літаратуры АН СССР (Пушкінскі дом) распрацаваў прынцыпова іншую схему выданьня ПЗТ. Кожны том ПЗТ Тургенева (адказны рэдактар акадэмік Міхаіл Аляксееў), Астроўскага (прафэсар Уладзімер Лакшын), Някрасава (прафэсар Барыс Мельгуноў), Дастаеўскага (акадэмік Георгі Фрыдлендэр) меў адмысловы артыкул, дзе чытачу распавядалася, што адбывалася ў гэты пэрыяд з аўтарам, з




**Максім Танк. Збор твораў. У трынаццаці тамах. Т. 1, 2.** — Менск: Беларуская навука, 2006.




краінай, з публікай, як Гісторыя ўрывалася ў літаратурную творчасьць канкрэтнага клясыка. Бывала, гэты артыкул займаў да чвэрткі (!) тому!

Тое, што прапанавалі чытачу ўкладальнікі і рэдактары ПЗТ Танка, — крок назад калясальны! Не ў савецкую нават — у сталінскую эпоху. Каб у гэтым пераканацца, досыць будзе ўчытацца ў другі том Збору твораў.

Пазбаўлены хоць якіх-кольвек тлумачэньняў, Максім Танк паўстае перад чытачом як… сталініст. Прачытаем адвольна ўрыўкі зь ягоных вершаў 1939—1954 г.

Нямала ёсьць сонечных песьняў такіх,
Як гэта, зь якой мы век дружым, —
Пра Сталіна і пра яго баявых
Паплечнікаў верных і мужных.

Або:

Сталін даў нам арліныя крыльлі,
Каб ня зналі мы зморы ў баю,
Каб, узьняўшы ў палёт эскадрыльлі,
Баранілі радзіму сваю.

Або:

І думае ён аб краінах, народах,
Аб днях камунізму, што сонца ярчэй,
Аб новых каналах, пасёлках, заводах,
Аб шчасьці мільёнаў працоўных людзей.

Пракамэнтаваць зьяўленьне такіх радкоў надзвычай проста. Танк — паэт Заходняй Беларусі, паэт-рэвалюцыянэр, які адседзеў свой арышт у турме ў буржуазнай Польшчы, шчыра ўдзячны Сталіну за ўзьяднаньне дзьвюх частак Беларусі ў адно цэлае. Абок таго, Танк — перакананы камуніст, які ў гэты пэрыяд верыць у Сталіна, як у Бога. Напішэце гэта, панове акадэмічныя «літаратуразнаўцы», — і любы нармалёвы чытач адразу зразумее, што гэтая Танкава шчырасьць дарагога варта — значна даражэй, чым каньюнктуршчына паэтаў-чыноўнікаў, што апяваюць будучых правадыроў, у тым ліку й беларускіх. У Танка ж нават у сталінскіх вершах няма бяздарных і бездапаможных рыфмаў кшталту «Товарищ президент, / Настанет тот момент…». Дый саромецца няма чаго: у тую пару зусім аналягічныя Танкавым вершы пішуць Люі Арагон, Бэртальд Брэхт, Юліян Тувім. Бясспрэчныя ж клясыкі! Так і трэба гэта расттлумачыць.

Але даць любое тлумачэньне — значыцца, узяць на сябе адказнасьць. А ў нашай акадэмічнай сыстэме адказнасьці за тлумачэньне, выглядае на тое, ніхто браць на сябе ня хоча. У выніку чытач і атрымлівае ня «сталіншчыну» нават літаратуразнаўчую, але «гніламёдаўшчыну», што яшчэ горш: відавочны навуковы анахранізм «уцюхіваецца» яму праз 53 гады пасьля сьмерці «бацькі народаў»! І не таму, што Лукашэнка прачытаў спробны том і камэнтары яму не спадабаліся, а толькі праз намэнклятурную баязьлівасьць: а раптам прачытае, а раптам прыйдзецца недаспадобы?! І не Лукашэнку нават, а якомусь чарговаму Скобелеву.

ПЗТ Танка становіцца калясальным «крокам назад» нават насупраць ПЗТ Янкі Купалы. Купалу мы ў стане сёньня агарнуць разуменьнем яшчэ і таму, што большая частка ягоных галоўных тэкстаў была вядомая сучасным (не Купалу, а нам) чытачам задоўга да зьяўленьня ПЗТ. А што было б, калі б выйшаў у сьвет асобна том ягоных вершаў, напісаных прыблізна ў тыя самыя гады, што і выдадзеныя ў якасьці ПЗТ вершы Танка?! Божа мой, гэта было б ужо не самагубства, але забойства клясыка — калі б чытача абмежавалі на пэўны час «ляўкоўскім цыклем».

Але ж менавіта так і зрабілі выдаўцы ПЗТ — абмежавалі нас паэзіяй сталінскае эпохі.

Выпадае толькі ўсклікнуць разам з самім Максімам Танкам:

І сёньня вы — каго паэт любіў,
З кім разам жыў — у сьмерць яго ня верце.
Калі на час ён, змораны, спачыў,
На варце стойце славы і бясьсьмерця!

Танк любіў свайго чытача і верыў у яго. Апошні спадзеў — што чытач сам, без дапамогі ўпаўнаважаных урадам літаратуразнаўцаў, адрозьніць жамчужныя зярняты паэзіі Танка ад акадэмічных плевелаў і, прыняўшы як належнае, як гістарычнае зьявішча «савецкага Танка», забудзецца пра саўковы ўзровень падрыхтоўкі яго Поўнага збору твораў.

Шкада, канечне, што менавіта Танку, аўтару «Люцыяна Таполі» і «Нарачанскіх соснаў», так не пашэнціла.

Зрэшты, такая няўдача не ўпершыню. У верасьні 1994 г. супрацоўніца Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі Ніна Марчанка распавяла мне пра стан здароўя Яўгена Скурка. Разам мы падрыхтавалі цыдулку на імя прэзыдэнта з просьбаю вылучыць грошы на лекі для клясыка. Няшмат: тысячу даляраў.

Рэакцыя прэзыдэнта была станоўчай. Аднак яе перакрэсьліла іншая рэзалюцыя — векапомнага кіраўніка справамі Івана Ціцянкова: «Грошай няма».

Чытаючы сарамлівую спасылку на «сьціслы тэрмін падрыхтоўкі» ў рэдакцыйнай прадмове, хочацца ўзвыць ад крыўды й болю: людзі, досыць гаварыць эўфэмізмамі, то бок — маніць! Скажэце сумленна: грошай для Танка зноў няма.

# Пабачыў сьвет «Інтымны дзёньнік» Багдановіча

Самы вялікі прыкол кнігі з інтрыгоўнай назваю «Інтымны дзёньнік» у тым, што ніякага інтымнага дзёньніку ў новым выданьні няма. Затое ёсьць прадмова Рыгора Барадуліна, афармленьне Арлена Кашкурэвіча і рэцэнзэнт Пятро Васючэнка. Укладальнік Уладзімер Сіўчыкаў папросту скарыстаў у назьве раскручаны брэнд. Маўляў, паэзія, — гэта і ёсьць інтымны дзёньнік, абгрунтоўвае ў прадмове факт такой адсутнасьці кандыдат у Нобэлеўскія ляўрэаты. Але гэты валошкавы рэмікс і без Максімавых курортных нататак будуць купляць, і чытаць, і цемнавокім паням дарыць. Багдановіч не старэе.

**Яўген Квач**

**Багдановіч Максім. Інтымны дзёньнік.** — Менск: Радыёла–плюс, 2006. — 528 с.




**Пра інтымны дзёньнік Багдановіча ў «Нашай Ніве»:**

www.nn.by/2002/04/09.htm «Для друку / не для друку»

Адам Глёбус. www.nn.by/2002/04/10.htm «Што думаў, тое й пісаў»

Паліна Качаткова www.nn.by/2002/04/12.htm «З–пад бацькавай апекі»

Сяргей Харэўскі. www.nn.by/2002/04/11.htm «Дзёньнікі мастакоў»




# Атлянтыда ў шумавіньні радыёхваляў

Выйшла з друку кніга «Беларуская Атлянтыда», укладзеная Вячаславам Ракіцкім, мадэратарам і вядоўцам аднайменнае перадачы на радыё «Свабода». Гэта чарговае выданьне з сэрыі «Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе».

Стаўленьне беларусаў да Бога, каханьне й любоў, ежа й пітво, улада й люд просты — пра ўсё гэта гавораць удзельнікі перадачаў: культуролягі, мастацтвазнаўцы, гісторыкі ды фальклярысты. Зь іх расповедаў паўстае велізарны абсяг нашае колішняе цывілізацыі, што быў пакінуты й забыты нашчадкамі. «Міты й рэаліі эўрапейскай нацыі, што адкрыліся ў глыбіні мінуўшчыны Вячаславу Ракіцкаму й ягоным спадарожнікам, агаломшваюць, як агаломшвае чалавека першая ў жыцьці сустрэча з морам», — напісаў у прадмове Аляксандар Лукашук.

Да аповедаў суразмоўцаў дапасавалі гравюры нашага клясыка Валера Славука, які некалі аздобіў і «Шляхціца Завальню». Густоўная аздоба й якасны выраб робяць кнігу адным з найлепшых узораў паліграфічнае культуры. Гэткія кнігі патрэбныя нам сёньня, як, пэўна, ніколі ў нашай гісторыі. Каб сапраўдную беларускую цывілізацыю не напаткаў лёс мітычнае Атлянтыды.

**СХ**

**Ракіцкі В. Беларуская Атлянтыда.** — Радыё Свабода, 2006. — 504 с.

**Прэзэнтацыя кнігі пройдзе 25 траўня** ў менскім Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3). Пачатак а 16–й.



## 18 траўня абвесьцяць ляўрэатаў прэміі «Залаты апостраф»

18 траўня ў вялікай залі Дому літаратара (вул.Фрунзэ, 5) адбудзецца вечарына ўшанаваньня ляўрэатаў традыцыйнае літаратурнае прэміі часопісу «Дзеяслоў» у намінацыях «Лепшая паэзія», «Лепшая проза», «Дэбют году». Пачатак а 18:30. Уваход вольны.

# «НОМ» зьняў беларусаў

Расейскія авангардысты зьнялі фільм пра Беларусь.

У красавіку творчая суполка НОМ прэзэнтавала стужку пад назвай «Беларуская быль», праца над якой вялася два гады. Вядомы санкт-пецярбурскі музыка і рэжысэр Андрэй Кагадзееў распавёў «НН» пра чарговы кінатвор «НОМ-фільму».

**«Наша Ніва»: Адкуль у Вас зьявілася цікавасьць да беларускай тэмытыкі?**

**Андрэй Кагадзееў:** Беларусь для нас — частка той вялікай «сям'і народаў», у якой мы жылі 70 гадоў. Найперш ваша краіна асацыюецца з Васілём Быкавым, ансамблем «Песьняры», белым буслом і партызанамі. Але гэта яшчэ і жахліва дарагія і звыродлівыя катэджы мытнікаў у ваколіцах Берасьця і рэдкая па ўбостве, нечалавечая працэдура прахаджэньня гэтай самай мытні, якая найлепшым чынам характарызуе «парадак», што так услаўляе ваш прэзыдэнт...

**«НН»: Якімі крыніцамі Вы карысталіся пры працы над фільмам? Ці адбіліся на «Беларускай былі» традыцыі беларусьфільмаўскіх стужак?**

**АК:** Апошні прадукт ад «Беларусьфільму», які я бачыў, — «Паміж жыцьцём і сьмерцю» зь Яўгенам Сідзіхіным у галоўнай ролі. Ніякіх станоўчых уражаньняў стужка не пакінула. Такое адчуваньне, што ў галовах стваральнікаў падобных фільмаў адбыліся незваротныя працэсы, выкліканыя ці то хадой вашай гісторыі, ці то праўленьнем аднаго чалавека цягам такога доўгага часу. Пры стварэньні фільму я карыстаўся выключна асабістымі ўражаньнямі ад шматразовых наведваньняў Беларусі.

**«НН»: Як рэагавала публіка на паказах у Маскве і Піцеры?**

**АК:** Фільм атрымаўся цалкам адпаведным першапачатковай задуме. Асабліва ўдалай лічу апэратарскую працу ды акторскую гульню. Прэм'ерныя паказы сабралі шмат гледачоў, прычым праходзілі яны ня ў кінасалёнах, а ў клюбах. Паколькі мы працуем у жанры «палітнекарэктнай камэдыі», люд і рэагаваў адпаведным чынам. Так што на паказах рогат не сьціхаў.

**«НН»: Ці пабачаць «Беларускую быль» у Беларусі?**

**АК:** На жаль, паказу фільму ў Беларусі не плянуецца, але дыск можна замовіць праз наш сайт.

**Гутарыў Сяргей Будкін**



**Андрэй Кагадзееў.**

Беларусь — гэта Быкаў, «Песьняры» і партызаны. А яшчэ звыродлівыя катэджы мытнікаў у Берасьці і нечалавечая працэдура прахаджэньня гэтай самай мытні.




**«Беларуская быль» —**

трэці фільм вытворчасьці суполкі «НОМфільм». Да гэтага былі стужкі «Пасека» і «Геапаліпы», прэзэнтаваныя на Ратэрдамскім кінафэстывалі — 2005. НОМ таксама мае калекцыю сваіх ранейшых кіна- і відэапрацаў, сабраную на трох DVD. Усю гэтую прадукцыю можна замовіць праз сайт www.nom.spb.ru ў разьдзеле «Глупы дом».

Дзея «Беларускай былі» пачынаецца ў 1945-м, калі савецкія салдаты вяртаюцца дамоў з Бэрліну з рознымі «адваяванымі» трафэямі. Герой фільму — жаўнер беларускай нацыянальнасьці — выбіваецца з агульнай масы. Ён разумнейшы за астатніх і вязе зь Нямеччыны дарожны знак. Падзеі фільму пачынаюць разгортвацца ў паваеннай Беларусі, а потым дзея пераходзіць у наш час.

# Шлях

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

Калі адбываеш у вёсцы двухгадовую палітычную высылку, ужо падумваеш пра ўмоўна-датэрміновае вызваленьне, і раптам даведваесься, што ты тут ня першы, а хто-ніхто з палітвязьняў 250 гадоў таму па сканчэньні ўнівэрсытэту праседзеў у Сітне ўсё астатняе жыцьцё — дзякуеш Богу за лёгкі шлях.

Вестка пра майго папярэдніка-дысыдэнта, пісьменьніка, хрысьціяніна — прыйшла, уявіце сабе, са Стакгольму.

Яшчэ ўзімку найлепшая ў Эўропе беларуская міліцыя не прапусьціла да мяне ў госьці кіраўніка прадстаўніцтва Швэцыі ў Беларусі Стэфана Эрыксана. Цэлая група па захопу затрымлівала й разварочвала швэда ўжо ў Сітне: пільныя праваахоўнікі не дазволілі нават перадаць мне кніжкі ды прадукты: «А раптам вы яго атруціце!..» Кніжкі дыплямат праз бацькоў усё-такі перадаў. Сярод іх аказалася цудоўнае выданьне беларуса Андрэя Катлярчука, які працуе зараз ва ўнівэрсытэце Стакгольму — «Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі». Абавязкова раю прачытаць: Катлярчук літаральна адкрыў у беларукай гісторыі ***трэцяе вымярэньне*** — апроч усходняга, праваслаўнага і заходняга, каталіцкага, — яшчэ й паўночнае, пратэстанцкае. У надзвычай цікавым дасьледаваньні — і Полацак варaскіх часоў, і прашвэдзкі пратэстанцкі рух Рэчы Паспалітай, і эвангельскія ўплывы са Скандынавіі XX ст.

Неўзабаве атрымліваю ліст ад самога Андрэя — у працяг швэдзка-пратэстанцкай тэмы.

«Па Вялікай паўночнай вайне на пратэстантаў ВКЛ, што дапамагалі Швэдзіі й Карлу XII, абрынулася хваля рэпрэсіяў, — піша Андрэй Катлярчук, — каталіцкі ўрад зачыняў зборы й школы, натоўпы фанатыкаў палілі бібліятэкі й зьбівалі пастараў, шляхціча́ў-пратэстантаў, выціскалі з палітычнага жыцьця... Гэткім чынам на службу ў глухі замак *Сітна* на мяжы з Расеяй трапіў выпускнік Сарбоны шляхціч-кальвініст Стэфан Аледзкі. Пражыўшы ў Сітне ўсё жыцьцё, у 1757 г. Аледзкі пераклаў з францускай на польска-беларускую макаранічную мову культавую кнігу эўрапейскіх пратэстантаў «Шлях пілігрыма» ангельца Джона Буньяна (John Bynuan. *The piligrim's progress*).

Неспавядальныя шляхі Твае, Госпадзе!

Кожнаму зь пілігрымаў, якія шукаюць Цябе, Ты вызначыў сваё падарожа.

Аднаго, як Джона Буньяна, што напісаў сваю кнігу ў турме й зрабіўся апосталам рэфармацкага руху, вядзеш праз пакуты да сусьветнае славы.

Другога, як Стэфана Аледзкага, што пераклаў Буньяна для беларусаў ды палякаў — скрозь непрыняцьце ды забыцьцё да раптоўнае згадкі праз чвэрць тысячагодзьдзя.

Трэцяга, Андрэя Катлярчука, што дабраўся ажно да Стакгольму, шукаючы Тваіх сьлядоў у гісторыі, — праз жыцьцё на чужыне да

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 9 — 15 ТРАЎНЯ

**9 траўня: затрыманьні на флэшмобах**

Менскіх студэнтаў **Віталя** (юркаледж), **Алену** (БНТУ), **Андрэя** (БДЭУ) затрымалі міліцыянты і супрацоўнікі ў цывільным падчас віншаваньня вэтэранаў у парку Горкага: ад іх патрабавалі паказаць дазвол на акцыю. У апорным пункце ў іх праверылі дакумэнты ды адпусьцілі праз 15 хвілінаў.

У Магілёве **чатырох маладых сацыял-дэмакратаў** (**Сьвятлана** і інш.), якія меліся віншаваць вэтэранаў, затрымалі за бел-чырвона-белыя стужкі й значкі «Свабода». Пратаколаў затрыманьня не складалі.

Увечары міліцыянты затрымалі **22 удзельнікаў флэшмобу**, якія меліся прайсьці з запаленымі сьвечкамі ад цырку да плошчы Перамогі, каб ушанаваць памяць вэтэранаў.

**10 траўня: «Жыве Беларусь» на шыльдзе пасольства ў Маскве**

Стала вядома, што крымінальная справа аб зьнікненьні **Юр'я Захаранкі** падоўжаная да 24 чэрвеня.

У Маскве 23-гадовы грамадзянін Беларусі **Іванюковіч** на шыльдзе пасольства Беларусі ў Расеі на Марасейцы напісаў чорным маркерам «Жыве Беларусь!» і «БТ хлусіць». На яго завялі крымінальную справу за «вандалізм», але адпусьцілі пад падпіску пра нявыезд. Хлопец працуе тэхнолягам у сталярнай кампаніі.

Каля плошчы Каліноўскага (Кастрычніцкай) у Менску затрыманы старшыня АГП **Анатоль Лябедзька**: яго завезьлі ў міліцыю перад акцыяй памяці Юр'я Захаранкі. Перад акцыяй затрымалі **Юлію Гарачку**, а таксама моладзевую актывістку **Любоў Кучынскую**. Гэтую АМАПаўцы зьбілі, ды так, што яна трапіла ў шпіталь з гіпертанічным крызам. Падчас самой акцыі затрыманыя **Барысевіч, Грышэня, Зьміцер Панфілаў, Крысьціна Шацікава, Тацяна Дзядок, Вольга Жураўлёва, Генадзь Колтун, Сяргей Лысы, Канстанцін Вусянок, Зьміцер Шаўлюкевіч, Саблюкевіч, Андрэй Кім, Віталь Сімановіч, Аляксандар Савін, Павал Паўлоўскі.**

**11 траўня: суды за ўлёткі,ператрус у Хільмановіча**

У Гомелі 20-гадовая моладзевая актывістка **Аксана Сергіенка**, арыштаваная на 15 сутак за распаўсюд 1 траўня ўлётак у абарону правоў працоўных, абвесьціла галадоўку. Яе засудзілі 6 траўня за «хуліганства».

У Віцебску 11 траўня пачаўся працэс супраць журналіста **Вадзіма Баршчэўскага**. Яго судзяць за знойдзеныя 31 сакавіка ў аўтамабілі 25 тыс. улётак «Народны кантроль» пра падзеі на плошчы Каліноўскага (Кастрычніцкай) у Менску. Суд, аднак, перанесены на 22 траўня, бо не прыйшлі міліцыянты-сьведкі.

У кватэры ў гарадзенскага праваабаронцы й журналіста **Уладзімера Хільмановіча** адбыліся ператрусы, санкцыяваныя пракурорам Менскай пракуратуры ў рамках крымінальнай справы

# пілігрыма

захапляльных адкрыцьцяў для Бацькаўшчыны.

Нарэшце й мяне — па дарозе з саўковае РБ да сапраўднае Беларусі — спыняеш у простай вёсачцы, якая не перастае зьдзіўляць глыбінёю гісторыі й насычанасьцю сэнсам.

Што было ў Сітне часоў Аледзкага? Памежны замак, дзе Стэфан кіраваў невялікай залогаю; мытня на шляху з Пскова да Полацку, на месцы якой дзятва дагэтуль капае старажытныя манэты; карчма, ля якой любы падарожны можа сёньня падабраць ашкелкі даўняе керамікі й дзе, як і зараз ля крамы, ашываліся тагачасныя бражнікі; Расея, зь якой сюды цягнулася галеча й наяжджалі разбойнікі... Усё амаль як цяпер.

Што вартаваў Стэфан Аледзкі на мяжы з Расеяй, калі Масква ўжо напоўніцу гаспадарыла і ў Полацку, і ў Вільні, і ў Варшаве? Што сказаў бы, калі б даведаўся, што выхаванцы ягонае альма-матэр тыднямі ваююць з урадам, каб іхнія працоўныя месцы на дасталіся *ўсякім палякам*, што паляк Ян Павал II ад імя ўсяго Каталіцкага касьцёлу пакаяўся перад іншаверцамі за колішнія рэпрэсіі, а беларускія пратэстанты, якіх ізноў залічваюць да «нетрадыцыйнага для Беларусі веравызнаньня», стаяць поплеч з ксяндзамі ў намётавым гарадку супраць тыраніі?..

Які шлях прайшоў Стэфан Аледзкі? З бліскучай адукацыяй, у пажыцьцёвым выгнаньні, у глушэчы, сярод безнадзёгі, на тле грамадзкага ўпадку, гаспадарчага бязладзьдзя й палітычнай нецярпімасьці — пераклаў кнігу ў духу гэткіх жа гнаных хрысьціянаў па ўсёй Рэчы Паспалітай. Ня выракся веры, не апусьціў рукі, ня сьпіўся — і вось, праз два з паловай стагодзьдзі ўжо на старонках першай беларускай газэты зноў завітвае да тысячаў суайчыньнікаў, каб падбадзёрыць іх: «Вышэй галаву, бывала й горш!»

Часам нам здаецца, што мясьціны шэрыя, часы змрочныя, людзі нудныя, а жыцьцё марнае — але менавіта сум сьвету, тлум чалавечы й доўгае чаканьне ёсьць абавязковай платай пілігрыма за спатканьне са сьвятасьцю.

Спачатку ў кожнага пілігрыма свой шлях. Кожны пакідае ўласную хату са сваімі думкамі, уласным грахом, пакаяньнем ды пакліканьнем. Кожны ўяўляе падарожжа пасвойму, размаўляе з Богам асабіта й адольвае цяжкасьці самотна. Але па меры набліжэньня да мэты сустракае тых, хто ідзе туды ж, куды й ён — і асобны шлях уліваецца ў супольную пілігрымку. Чароды падарожнікаў злучаюцца: на дарозе ўжо хроснае рушаньне пад агульнымі сьцягамі й харугвамі, з дружнымі гімнамі й шматтысячным рокатам малітвы... І калі дзясяткі, сотні тысячаў вернікаў, паплечнікаў, вандроўнікаў зьбіраюцца разам ля самое сьвятыні — кожны бачыць на сваe вочы, што ягоны няблізкі й цяжкі, але ўпарты асабісты шлях урэшце вёў да ўсеагульнага нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

Ня выракся веры, не апусьціў рукі, ня сьпіўся — і вось, праз два з паловай стагодзьдзі ўжо на старонках першай беларускай газэты зноў завітвае да тысячаў суайчыньнікаў, каб падбадзёрыць іх.

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 9 — 15 ТРАЎНЯ

«Партнэрства». Супрацоўнікі КДБ канфіскавалі кампутарную тэхніку й дакумэнты ГА «Фонд імя Лява Сапегі». Пасьля гэтага іншая група супрацоўнікаў КДБ запатрабавалі, каб журналіст прысутнічаў наператрусе іншай прыватнай кватэры (у рамках той самай справы), дзе таксама канфіскавалі кампутарную тэхніку, якая належала Хільмановічу й **Віктару Сазонаву**.

Супрацоўнік КДБ Андрэй Казганка спрабаваў уручыць берасьцейскай актывістцы **Паліне Панасюк** позву да сьледчага Ю.Гара. Дзяўчына не адчыніла дзьверы, а папрасіла пасласць ёй позву поштай.

Журналістцы «Газеты Слонімскай» **Вользе Шынкевіч** начальнік інспэкцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя Слоніму і Слонімскага раёну Мікалай Дзегцяроў адмовіўся падаць інфармацыю.

### 12 траўня: тры месяцы арышту Сасіма

У Баранавічах моладзевага лідэра **Мікіту Сасіма** прысудзілі да 3 месяцаў арышту за «ўхіленьне ад вайсковай службы». Да суду Мікіта адбыў 2 месяцы ў Баранавіцкім СІЗА, яму засталося дабыць за кратамі 1 месяц.

АМАПаўцы не давалі стаяць каля турмы на Акрэсьціна ў Менску дэмакратычным актывістам, якія прыйшлі сустрэць выхад зь вязьніцы **Аляксандра Мілінкевіча, Аляксандра Бухвостава, Зьмітра Дашкевіча**. Пасьля сустрэчы былі затрыманыя **Мацей Чысьцік, Тацяна Камкар, Уладзіслаў Петрушэнка, Ільля Богдан, Аўген Шадко, К.Вусянок, Дзяніс Апаровіч, Ірына Завадзкая, Аляксей Казулін, Наста Чахоўская, Саша Сайфуліна, Сяргей Сарока, Аляксей Мікульчык, Антось Каліноўскі, Крысьціна Сарпаева.**

У Берасьці міліцыянты спынілі на вуліцы **Андрэя Любенчука**, на заплечніку якога была налепка «Свабода!»: у яго з заплечніка сканфіскавалі 58 такіх налепак і склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак.

Кіраўніцу РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт» **Тацяну Процьку** ня выпусьцілі ў Бэрлін для выступу пра сытуацыю з правамі чалавека ў Беларусі: дазвольны штамп у пашпарце скасавалі, канфіскавалі гадавы даклад БХК, відэафільм пра выбары прэзыдэнта й іншыя матэрыялы.

У Жлобіне затрымалі **5 моладзевых актывістаў** з Жлобіна й Гомелю (**Эдвард Зелянкоў** і інш.), якіх зьвінавацілі ў распаўсюдзе друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак.

Суд Першамайскага раёну Менску апраўдаў лідэра БСДГ **Станіслава Шушкевіча**, якога вінавацілі ў актыўным удзеле ў акцыі салідарнасьці з палітвязьнямі 1 траўня.

Падчас флэш-мобу з марозівам на плошчы Каліноўскага (Кастрычніцкай) у Менску затрыманыя каля **10 удзельнікаў**.

Пракуратура Цэнтральнага раёну Менску адмовіла **Вячаславу Сіўчыку** ў пачатку крымінальнай справы па факце яго выкраданьня і замаху на забойства, абгрунтаваўшы гэта адсутнасьцю грамадз-


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Судзьдзя Першамайскага суду Тацяна Масальская, якая некалі адмовіла Лябедзьку ў пазове да БТ, апраўдала Станіслава Шушкевіча. Яму пагражалі суткі за арганізацыю несанкцыянаванага шэсьця на ўгодкі Чарнобылю. Такі прысуд стаў нечаканасьцю нават для самога палітыка.**

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 9 — 15 ТРАЎНЯ

ка небясьпечнага дзеяньня.

У Бабры затрымалі мастака **Алеся Пушкіна**: яго падазраюць у абліваньні фарбай помніка савецкаму сьмершаўцу Васілю Чабатарову, які запомніўся жыхарам Бабра ў вайну як падпальшчык хатаў. Дома ў Пушкіна правяліператрус, сканфіскавалі кнігі Зянона Пазьняка, падшыўку «Нашай Нівы», часопіс «ARCHE». Выпусьцілі мастака толькі 15 траўня.

Пачаўся судовы працэс па аднаўленьні на працы звольненага 17 сакавіка актывіста КХП БНФ **Кастуся Кашаля** — супрацоўніка дзяржаўнага ўнітарнага прадпрыемтва «Ўнікаштмэт БДУ». Суд працягнецца на пачатку чэрвеня.

### 14 траўня: затрыманы Палубятка

Падчас сьвяткаваньня афіцыйнага Дня дзяржаўнага сьцяга і герба ў Мастах міліцыянты затрымалі актывіста БСДП (Г) **Язэпа Палубятку** за распаўсюд улётак (з выходнымі зьвесткамі) у падтрымку зьняволенага Аляксандра Казуліна. 5 афіцэраў міліцыі адмовіліся складаць на Палубятку пратакол, пагадзіўся шосты — маладзенькі лейтэнант.

У Салігорску моладзевыя актывісты ўзьнялі нацыянальны сьцяг. Міліцыянты ў цывільным затрымалі сьведку акцыі **Ўладзімера Гарэлікава** й трымалі яго ў пастарунку 4 гадзіны, удзельніка акцыі **Ўладзімера Шылу** спрабавалі затрымаць.

### 15 траўня: Леванеўскі на свабодзе

**АГП** на 15 траўня атрымала каля 20 адмоваў на просьбу даць памяшканьне, каб правесьці 28 траўня чарговы X зьезд партыі. У крайнім разе партыя гатовая правесьці зьезд па-за межамі краіны.

Гомельскіх актывістаў АГП **Андрэя** і **Кацярыну Толчыных** адміністрацыйная камісія Савецкага раёну аштрафавала на 5 базавых велічыняў кожнага за распаўсюд 24 красавіка ўлётак пра забарону аблвыканкамам чарнобыльскага мітынгу з удзелам Аляксандра Мілінкевіча. Паседжаньне камісіі адбылося завочна, пастанову Толчыны атрымалі поштай.

Кіраўніцтва калёніі «Віцьба-3» адмовілася перадаць палітвязьню **Сяргею Скрабцу** лекі ад алергіі.

**Аляксандру Казуліну** выстаўленае канчатковае абвінавачаньне: яго вінавацяць у злосным хуліганстве 2 сакавіка й арганізацыі вулічных беспарадкаў 25 сакавіка. Палітыку пагражае да 6 гадоў пазбаўленьня волі.

Суд Гомельскага раёну адмовіў актывісту прафсаюзу РЭП **Аляксандру Еўсейчуку** ў пазове на абарону гонару і годнасьці на адрас дырэктара аўтапарку №1 Хадакоўскага. Прафсаюз падаў доказы абразаў Хадакоўскага на адрас Еўсейчука, аднак суд прыняў бок адказчыка. Адна зь сьведак з боку дырэктара на судзе заявіла, што ў яе чацьвёра дзяцей, што яна хоча працаваць у аўтапарку, таму нічога гаварыць ня будзе.

Выйшаў на волю пасьля двух гадоў зьняволеньня палітвязень **Валеры Леванеўскі**.

У Віцебску на 1 б.в аштрафавалі моладзевага актывіста **Віталя Броўку**, абвінавачанага ў дробным хуліганстве. Паводле гэтага абвінавачаньня Броўку й ягонага сябра **Антона Эрдмана** ужо каралі: 23 сакавіка іх затрымалі ў Менску, прывезьлі пад канвоем у Віцебск, дзе яны былі 3 сутак у ізалятары.

Пачаўся судовы працэс за «зьнявагу работніка міліцыі» над віцебскім моладзевым актывістам **Сьцяпанам Цішуціным**: яго затрымалі 14 траўня, склалі пратакол за дробнае хуліганства і зьмясьцілі ў ІЧУ. На судзе Цішуцін запатрабаваў адваката. Судзьдзя пагадзілася даць яму час на пошук абаронцы, але міліцыянты зноў завезьлі яго ў ізалятар. Тады Цішуцін зьвярнуўся з хадайніцтвам пра выклік дадатковых сьведкаў, і працэс быў перанесены на 17 траўня.

Актывіст Свабоднага прафсаюзу **Юры Рыжкоў** 24 сакавіка звольнены, па словах кіраўніцтва, за неналежнае выкананьне абавязкаў, але з афіцыйнай фармулёўкай «па дамоўленасьці бакоў» (працаваў грузчыкам у краме «Надзея» ў Менску). Падчас кампаніі адміністрацыя крамы двойчы папярэджвала яго за агітацыю на працоўным месцы.

У Лідзкім райсудзе на 6 месяцаў арышту асудзілі 62-гадовага актывіста АГП, былога міліцыянта **Івана Крука** з Астраўца: яго абвінавацілі, што перашкаджаў праводзіць міліцыянтам ператрус у сваёй кватэры. Крук разьбіў кампутар, які ў яго хацелі канфіскаваць. Таксама актывісту прысудзілі штраф у 200 тыс.руб. на карысьць аднаго з пацярпелых міліцыянтаў.

**АШ**

# Вершы на экспарт

Анталёгія беларускай паэзіі «Сувязьразрыў» па-ўкраінску, Хадановіч па-польску.

Выхад перакладных кніг беларускай паэзіі ў нашыя дні — зьява ня частая. 12 траўня ў Беларускім ПЭН-Цэнтры адбылася прэзэнтацыя адразу двух выданьняў: вершаў Андрэя Хадановіча «Święta Nowego rocku» («Калядны рэп») і беларуска-ўкраінскай анталёгіі «Сувязьразрыў—Зв’язокрозрив». Абедзьве кнігі выйшлі з паралельнымі тэкстамі: Хадановічава — беларуска-польская, анталёгія — беларуска-ўкраінская.

У беларуска-ўкраінскую анталёгію, якая рыхтавалася да выхаду ў Львове 3 гады, увайшлі па 12 аўтараў з кожнага боку. Слова «бок» тут азначае ня толькі краіну, але і ўласна бок кніжкі. Хочаш — адкрываеш кнігу з аднаго боку і чытаеш беларускіх аўтараў у арыгінале і ўкраінскіх перакладах, хочаш — перавяртаеш кнігу і чытаеш украінскія вершы ў арыгінале й па-беларуску. Некаторыя з аўтараў аднае часткі выступаюць перакладнікамі ў другой.




**Chadanowicz, A. Świkta nowego rocku.** — Wrociaw: Kolegium Europy Wschodniej, 2006. — 123 s.




**Сувязьразрыў/ Зв’язокрозрив.** — Кіеў, 2006.



АРЦЁМ ЛЯВА

**Некаторыя вершы для сваёй першай польскамоўнай кнігі Андрэй Хадановіч выбіраў з 15 варыянтаў перакладу.**

Назва «Сувязьразрыў», як прызнаўся Хадановіч, была пазычаная з аднайменнай паэмы Міхася Баярына, ананімна зьмешчанай у Інтэрнэце.

Беларуская частка кнігі пачынаецца эсэ Валянціна Акудовіча «Алібі». За ім ідуць вершы Міхася Баярына, Уладзімера Арлова, Лявона Вольскага, Віктара Жыбуля, Джэці ды інш. Ва ўкраінскую ўвайшлі творы Аляксандра Ірванца, Віктара Небарака, Астапа Сьлівінскага і г.д. У сярэдзіне ж кнігі, як адзначыў на прэзэнтацыі А.Хадановіч, «сапраўдны банкет для мовазнаўцаў: не расейска-беларуская трасянка, не расейска-ўкраінскі суржык, а беларуска-ўкраінская трасянка. Украінскія выдаўцы кнігі паспрабавалі напісаць тэкст па-беларуску».

На прэзэнтацыі не абышлося без чытаньня вершаў. Марыйка Марцысевіч чытала свае пераклады зь Віктара Небарака — аўтара тэкстаў для рок-гуртоў «Плач Ераміі» ды «Мёртвы Певень». Джэці пачала перакладам твору Аляксандра Ірванца, а закончыла сваім вершам. «Я Сырынга, Сырынга, Сырынга, Сырынга», — скаланаў залю барабанны пошчак рытму.

Зьвязавым зьвяном у прэзэнтацыі абедзьвюх кніг выступіў А.Хадановіч: яго творы й пераклады ёсьць у абедзьвюх кнігах.

Уласна пра зборнік «Święta Nowego rocku» больш распавядаў ня сам аўтар, а Лявон Баршчэўскі — адзін з ініцыятараў выданьня. Кніга выйшла ўва Ўроцлаве ў сэрыі «Biblioteka białoruska». Гэта ўжо другое выданьне гэтай сэрыі: сёлета ў лютым у ёй ужо выйшла кніга твораў Васіля Быкава й Рыгора Барадуліна «Калі рукаюцца душы» ў перакладзе Чэслава Сэнюха. Напагатове й трэцяе выданьне сэрыі — кніга твораў Уладзімера Арлова. Да канца году, як адзначыў Л.Баршчэўскі, мае выйсьці яшчэ 2—3 кнігі беларускіх аўтараў у польскім перакладзе.

Варта дадаць, што кніга «Święta Nowego rocku» мае цудоўныя ілюстрацыі, якія зрабіў Андрэй Пакроўскі («Чкалава»).

**Адам Воршыч**

# Шпарагі

Веснавыя вітаміны ў нас пад нагамі.

Размова пойдзе пра гародніну, вядомую з далёкай старажытнасьці. У наш час яна займае тысячы гектараў найлепшай глебы ў шмат якіх эўрапейскіх і амэрыканскіх краінах. Шпарагі (Asparagus officinalis L.) — самая звычайная расьліна, распаўсюджаная па ўсім нашым краі ў дзікім стане.

Шпараг культывавалі яшчэ ў старажытным Эгіпце, больш за 2 тысячы гадоў да н.э. Яго выявы можна знайсьці на фараонавых саркафагах. У старажытнай Грэцыі ён быў сымбалем культу багіні каханьня Афрадыты. Шпарагавымі галінкамі шлюбавалі маладых, спавівалі шлюбнае ложа. Гэта й ня дзіва, зважаючы на тое, што шпараг, насамрэч, — магутны афрадазіяк. Сьведама вырошчваць гэтую расьліну як гародніну ў Эўропе пачалі рымляне.

Шпараг здаўна культываваўся і на Беларусі, але цягам год зьвёўся й забыўся. Спажываньне ж шпарагу не ўвайшло трывала ў народную кухню. Найперш таму, што расьціць яго цяжка і гатаваць няпроста. Затое гэта сапраўдны далікатэс, які ня зводзіцца з найлепшых рэстарацыяў і арыстакратычных сталоў Эўропы!

Зьбіраюць ураджай шпарагу толькі ў траўні, на пачатку лета. Пазьней шпараг губляе свае смакавыя й спажыўныя якасьці. Ядуць беленькія ці ружавата-салатавыя парасткі, што толькі праглянулі з-пад зямлі.

Важна перад ужыткам маладзенькія парасткі шпарагаў асьцярожна аблупіць вострым нажом. Тады іх адварваюць (ня вараць!). Каб шпарагі не ўсплывалі, іх перавязваюць ніткаю ў пучок і заважваюць каменьчыкам ці яшчэ чым да дна начыньня. Так іх на ціхенькім агні гатуюць з паўгадзіны. І, барані божа, не пераварваць!

А былі ж, былі шпарагі звычайнаю закускаю да вінаў на шляхецкіх сталах. Напрыклад, у Міцкевічавым «Пане Тадэвушы» яны згадваюцца як знак выкшталцонага густу:

> Пасьля падалі ракаў, куранят, ***шпарагі.***
> Наставілі вугорскіх вінаў і малагі.
> Ядуць і п'юць усе, але маўчаць…



**Спараг (Asparagus L.)** — родавая назва расьлінаў сямейства спарагавых. Самы пашыраны зь іх Спараг звычайны (Asparagus officinalis L.), шматгадовая трава. Зь яе карнявішча разьвіваюцца сьцябліны з мноствам тонкіх зялёных галінак; плод — чырвоная ягада памерам з гарошыну.



### Шпараг як лекавы сродак

Шпараг калісь быў надзвычай папулярным лекавым сродкам. Надземная частка ў сялянскай мэдыцыне ўжывалася пры хваробах сэрца, нырак, мачавіка. Плады дапамагаюць пры дыярэі, імпатэнцыі. Насеньне й настой зь яго ўжываліся таксама для павышэньня патэнцыі й пры атручаньнях. Як крыніцы вітамінаў на вясеньні пэрыяд прапаноўвалася шчаўе, лебяда і нават крапіва. А шпараг па карыснасьці перавышае гэтыя расьліны і ў беларускіх умовах дае плён з канца красавіка. З-за наяўнасьці аспаргіну шпараг вельмі карысны для дыябэтыкаў і хворых на падагру.

Вераемна, іх прарадзіма — усходняе Міжземнамор'е. Але найбольшых посьпехаў дасягнулі францускія сэлекцыянэры. Нашыя ж мелі гатункі ўласнае гадоўлі, напрыклад, «Ураджайны-6».

На выгляд дарослы куст шпарагаў усім вядомы як дэкаратыўны аспарагус, шырока ўжываны для букетаў. Але дэкаратыўны аспарагус горкі на смак, тады як ядомыя шпарагі хутчэй нагадваюць зялёны гарошак.

Шпараг дае плён раньняй вясною, калі іншыя культуры толькі сеюць альбо саджаюць. Пры гэтым не патрабуецца аніякіх цяпліцаў ці парнікоў. Зьбіраюць маладыя парасткі, якія ад пачатку траўня пачынаюць шпарка цягнуцца да сонца. Прыдатныя ў ежу павінны мець ад дваццаці да сарака сантымэтраў увышкі, іх зразаюць каля самага кораня. Калі парастак выганяецца вышэй, ніжняя частка яго цьвярдзее, і яе даводзіцца адкідаць. Увогуле шпарагі вясной растуць вельмі хутка, і зьбіраць іх трэба не радзей як два разы на тыдзень.

Шпараг — расьліна шматгадовая. Першы збор адбываецца на чацьвертую вясну ад моманту высеву і доўжыцца два тыдні. Наступнымі гадамі сэзон расьцягваецца да васьмі тыдняў. Па яго заканчэньні кустам даюць расьці вольна. Увосень, калі яны маюць больш чым паўтара мэтра ўвышкі, зразаюць на дзесяць-пятнаццаць сантымэтраў ад зямлі і на зіму не прыкрываюць.

Вядома, шпараг патрабуе клопату большага, чым звыклая нам бульба. Першая ўмова посьпеху — добрае насеньне. Сёньня гандаль прапаноўвае дастатковы выбар гатункаў ангельскай, нямецкай і польскай сэлекцыі, прыдатных для нашых умоваў.

Пасеяны шпараг мусіць заставацца на адным месцы дзьве вясны. На трэцюю расада пераносіцца на яе сталае месца. Каліўцы рассаджваюцца радкамі на адлегласьці ў сорак сантымэтраў. Радок ад радка можа быць 1,5—1,7 мэтра. Угнаеньні ўносяць пасьля збору ўраджаю, рассыпаючы па радкох. На адным месцы культура можа заставацца больш за дзесяць год.

Сям'і з чатырох чалавек пяцьдзясят кустоў даволі і для вясеньняга спажываньня, і для запасу замарожаных шпарагаў на зіму. Хопіць і для пачастунку знаёмых і радні.

**Сяргей Харэўскі; Аляксандра Марчанка, Горадня**



# Спосабы спажываньня і гатоўлі

Шпарагі можна ўжываць як сьвежыя, так і замарожаныя, бо і ў такім выглядзе не губляюць ані смаку, ані каштоўных уласьцівасьцяў.

Рэцэптаў выкарыстаньня шпарагаў шмат. Іх вараць, тушаць, запякаюць, дадаюць у супы. Шпарагі варацца ў падсоленай вадзе з дадаткам цукру й алею да мяккага стану. Далікатныя «галоўкі» дадаюць у канцы варкі. Можна адразу ж падаваць на стол гарачымі з маслам, а можна падсмажыць на алеі, пасыпаць цёртым белым сухарыкам і падаваць у гарачым альбо халодным стане. Страва можа быць самастойнаю і гарнірам да мяса.

### Суп

Булён — 1,5 л, шпарагі — 300 г, зялёны гарошак (марожаны альбо кансэрваваны) — 4 ст.л., галоўка цыбулі сярэдняй велічыні, адна морква, 1 ст.л. мукі, тры–чатыры лыжкі малака, пятрушка, масла ці алей, соль.

Парасткі шпарагаў пачынаюць чысьціць спадыспаду. Галоўку з двума–трыма сантымэтрамі сьцяблінкі адразаюць і кладуць асобна. Астатняе рэжуць на скрылікі ў адзін сантымэтар і гатуюць у булёне, дадаўшы гарошак, калі ён марожаны. Пакуль шпарагі гатуюцца, зрабіць сьветлую засмажку з пакрышанай цыбулі, натаркаванай на грубай тарцы морквы, прыцерушыць мукою. Усё перамяшаць і дадаць у булён. Калі шпарагі зьмякчэюць, дадаць галоўкі, некалькі лыжак малака і гарошак, калі ён кансэрваваны. Патрымаць на малым агні, пакуль усе складовыя часткі ня стануць мяккія. Прыняўшы з агню, дадаць пятрушку.

### Суфле

Шпарагі — 0,5 кг, вялікая цыбуліна, палова шклянкі малака, тры–чатыры яйкі, жоўты сыр — 50 г, чатыры лыжкі зялёнага гарошку, алей, чорны молены перац, соль.

Звараныя шпарагі адцадзіць, перакласьці на патэльню з алеем і крыху падсмажанай пакрышанай цыбуляй, перамяшаць, пасыпаць перцам і дадаць гарошак. Заліць сумесьсю малака зь яйкамі, пасыпаць сырам, патаркаваным на грубай тарцы, і паставіць у нагрэтую духоўку. Запякаць, пакуль падрумяніцца.

Я на двор зьбіраюся,
Хутка апранаюся.
Сонца ярка ў небе зьзяе
І мой тварык сагравае.
У крыжаванцы — што на мне,
Адгадаеце ці не?

1

2

3

4


5

6

7

8


Склала Малая Волька

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Фармат «4х4» 18–21 траўня

**«Маё сэрца біцца перастала»** («De battre mon coeur s'est arrete», Францыя, 2005).

Французская стужка, афіцыйна прызнаная найлепшай у краіне за мінулы год, — рэмэйк амэрыканскага фільму «Пальцы» Джэймса Тобака.

«Маё сэрца біцца перастала» ўяўляе сабой цікавы прыклад таго, калі не Галівуд робіць рэмэйк нейкага замежнага фільму, каб прывабіць амэрыканскага гледача, а наадварот, эўрапейскі рэжысэр Жак Адыяр («Чытай па вуснах») робіць сваю перапрацоўку работы галівудзкага стваральніка. Дый тэндэнцыя тут супрацьлеглая, мэта — пераасэнсаваньне, а не прымітывізаваньне.

Малады чалавек гадоў пад трыццаць (галоўную ролю выконвае Рамэн Дзюры, вядомы па стужках «Прыгажуні», «Арсэн Люпэн»), які працуе на свайго бацьку і займаецца паўкрымінальным бізнэсам, у нейкі момант вырашае стаць піяністам, як і яго маці. Гэта фільм пра наканаваньне, пра выбар, пра неадназначнасьць, пра тое, што не існуе ні чорнага, ні белага, ні добрага, ні дрэннага, а часам ты ўсё адно робіш выбар паміж імі. Як зьняць такое кіно бяз патасу? Спытайце ў Адыяра.

**«Тыгр і сьнег»** («La tigre e la neve», Італія, 2005).

Стужка, што зьяўляецца і камэдыяй, і драмай, але распавядае і пра каханьне, і пра вайну, прысьвечана гісторыі італьянскага паэта, што праз каханьне апынуўся ў Іраку падчас вайны ў Пэрсыдзкай затоцы. Рэжысэр фільму, Рабэрта Бэніні («Кава і цыгарэты», «Жыццё цудоўнае») не знайшоў лепшага актора за сябе на галоўную ролю і, магчыма, меў рацыю. Ідэальнае спалучэньне гумару, суму, аптымізму, здольнасьці бачыць несур'ёзнае ў сур'ёзным і рабіць гэта непавярхоўна — гэта тое, у чым Бэніні майстар.

**«Схаванае лязо»** («Kakushi–ken: oni no tsume», Японія, 2004).

Ня мае сэнсу казаць пра сюжэт японскага кіно, якой бы складанай ці простай ні была фабула фільму, пасьля прагляду ўсё адно высьветліцца, што кіно зусім не пра гэта, а пра іншае бачаньне сьвету. Тым, хто зь японскім кіно знаёмы, гэта зразумела, а для астатніх гэтая стужка — добрая нагода распачаць знаёмства, бо ў фільме ёсьць усё: гісторыя, традыцыі, каханьне, палітыка. Прыхільнікаў японскага вайсковага майстэрства прыйдзецца расчараваць, боек у фільме няшмат, але аматары японскага кіно ведаюць, што сапраўдны японскі дух зусім ня ў гэтым.




**«Майстэрства прыгожа расставацца»** («Un fil a la patte», Францыя, 2005).

П'есам французскага драматурга часоў Прыўкраснай Эпохі Жоржа Фэйдо ўласьцівыя лёгкасьць, тонкі гумар і бесклапотнасьць, усё тое, чым прываблівае цудоўны пэрыяд на пачатку мінулага стагодзьдзя. Складаныя сюжэты, лёгкая іронія, кпіны забясьпечылі п'есам Фэйдо доўгае жыцьцё на тэатральных сцэнах і ў кіно.

Твор Фэйдо, назоў якога літаральна перакладаецца як «Зьвязаны па руках і нагах», экранізуецца далёка ня першы раз, але затое ўпершыню ў ім здымаецца эратычная Эмануэль Бэар («Наталі», «8 кабет»), што грае гераіню, якую хоча кінуць яе каханак, але з французскай кабетай так проста не разлучысься, тут не абыдзецца бяз жарсьці, напалу, яскравых эмоцыяў і ўздыхаў.

На жаль, стваральнікі стужкі занадта далёка адышлі ад арыгіналу, а ад іскрыстага гумару Фэйдо, ад яго жартаў і іранічнасьці, выкшталцонасьці і досьціпаў засталіся толькі ўздыхі і вадэвіль, што зацікавіць можа ня кожнага. Тым ня менш кажуць, што ў французскіх кабетах ёсьць нешта такое прыцягальнае, чым можна апраўдаць прагляд і такой стужкі.

**Ганна Каморнік**

## КАІСА

# Два сьветы, два чэмпіянаты

У сьвеце — падрыхтоўка да перавыбараў прэзыдэнта ФІДЭ і аб'яднальнага матчу Тапалаў—Крамнік, у нас — чэмпіянаты краіны сярод ВНУ і клюбаў.

Беларуская шахматная ўнівэрсіяда прайшла ў канцы красавіка ў Нацыянальным тэхнічным унівэрсытэце. Удзел у спаборніцтвах бралі аж 24 каманды. Дошак для гульні ў БНТУ не хапіла, і асобным гульцам прыйшлося мігравацъ у СДЮШАР–11.

Колькасны рост суправаджаўся падзеньнем якасьці партыяў. Зборнай Міжнароднага інстытуту працоўных і сацыяльных стасункаў, што прайграла ўсе сустрэчы, удзельнікі раілі падужацца з пэнсіянэрамі ў парку Чалюскінцаў… Зрэшты, міжнародны майстар Раман Лаўрэцкі, супрацоўнік навучальнай установы ФПБ, паабяцаў скора правесьці сваіх выхаванцаў «у дамкі».

Кур'ёзам скончылася адна з «жаночых» партыяў: напачатку партнэркі забылі памяняць месцамі караля і фэрзя, а пазьнейшы пратэст быў адхілены. Згодна з рашэньнем судзьдзяў, якія спасылаліся на рэглямэнт ФІДЭ, калі ў партыі зроблены тры хады, то памылка ў расстаноўцы лічыцца «заігранай». Гэта зьбянтэжыла нязьменнага трэнэра каманды БДПУ Юр'я Тэпера: з–за новых правілаў пэдагогі страцілі паўбала.

Наймацнейшымі былі гаспадары пляцоўкі — Мікіта Маёраў, Аляксандар Скалазубаў, Уладзімер Раманенка, Яўген Лясота, Ірына Бялько, Ірына Кірык. Другое месца — у БДУ, трэцяе — у Гарадзенскага дзяржунівэру. Каманда ўнівэрсытэту фізвыхаваньня ня трапіла ў лік прызэраў, бо мела няроўны склад: гросмайстры — на першых дошках, аўтсайдэры — на апошніх.

У клюбным чэмпіянаце краіны (5—9 траўня) камплектаваньню камандаў увага надавалася за паўгоду да імпрэзы. Сёлета капітаны абышліся безь легіянэраў, аднак чэмпіёнскаму клюбу «Вясьнянка» ўдалося залучыць да сябе гросмайстра Аляксея Фёдарава, а «Вэктару», віцэ–чэмпіёну 2004—2005 гг., — рэйтынг–фаварыта Аляксея Аляксандрава. У выніку «Вясьнянка–Гран» перамагла ўва ўсіх сямёх турах, «Вэктар» прайграў толькі адзін матч. Добра выступіла і берасьцейска–гарадзенская каманда «Брэмар» — падзяліла 3—4 месцы зь менскім «Нэаквартам», саступаючы яму паводле рэйтынгу.

**ВР**



**Як бы вы згулялі?**

Р. Холмаў — А. Суэцін, Ерэван, 1962. Ход белых.

**Адказ:** 1. g6! fg (1...hg 2. Фd8+ і 3. Тf3) 2. Фd8+ Крf7 3. Тd5! і выйгралі. Абодва гросмайстры доўга жылі ў Беларусі, а памерлі ў Расеі (Ратмір Холмаў — 18 лютага 2006 г. ва ўзросьце 80 гадоў).

# Цэсьлер–Войчанка: The Best




**20 траўня** (сб) — Нацыянальны мастацкі музэй і кампанія «Брытыш–Амэрыкан Табака Трэйдынг Кампані» ў рамках міжнароднай ініцыятывы «Вясна музэяў» правядуць акцыю «Травеньская ноч». Прэзэнтуецца калекцыя найлепшых плякатаў творчага дуэту Ўладзімера Цэсьлера і Сяргея Войчанкі.

## ІМПРЭЗЫ

**Беларусь: храмы і людзі**

У галерэі візуальных мастацтваў «NOVA» (вул.Харужай, 16) да **30 чэрвеня** працуе выстава «Беларусь: храмы і людзі», дзе сабраныя фатаграфіі пачатку XX ст.

**Ізноў HARDCOREманія**

**26** (пт), 18.00 — гард–кор–фэст «HARDCOREманія: чаду!». Удзельнічаюць: «Куклы», «Рикошет», «З.Ь.М.Я.Я.», «Сок», «Внутренний смысл» (вакал — Дэйв, «Папёнкинz band») і інш. Квіткі: 9000 (танцпляц), 12 000 (столік + кампакт–дыск у падарунак). Продаж: пераход Я.Коласа. Даведкі па т.: 649–08–88, 766–24–25.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

**21** (ндз) — «Кармэн».

**Купалаўскі тэатар**

**19** (пт), **20** (сб) — «Вечар».
**21** (ндз) — «С.В.».
**22** (пн) — «Я не пакіну цябе...».
**24** (ср), **25** (чц) — «Эрык XIV».
**26** (пт) — «Парфён і Аляксандра».
**28** (ндз) — «Паўлінка».
*ранішнія спэктаклі*
**21** (ндз) — «Сьнежная каралева».
**28** (ндз) — «Паўлінка».
*малая сцэна*
**20** (сб) — «Муж для паэтэсы».
**22** (пн) — «Варшаўская мэлёдыя».
**26** (пт) — «Саламея».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**19** (пт) — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**20** (сб) — «Чорны квадрат».
**21** (ндз) — «Валянціна».
**23** (аўт) — «Нязваны госьць».
**24** (ср) — «Палёты з анёлам».

**Тэатар юнага гледача**

**19** (пт) — «Журавіныя пёры».
**19** (пт) — «Залатое сэрцайка».
**20** (сб) — «Дзень народзінаў ката Леапольда».
**21** (ндз) — «Каліф–башмачнік».

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 20 траўня

БТ, 14.45

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца Алесь Матафонаў.

Тэма чарговае перадачы — хлеб.

**БТ, 19.25**

«Матыль».

Францыя, 2002, рэж. Філіп Муіль.

Камэдыйная мэлядрама.

Стары бурклівы калекцыянэр і маленькая дзяўчынка–суседка шукаюць рарытэтнага матыля…

У ролях: Мішэль Сэро, Клер Буаніш.

**НТВ, 21.40**

«Адзінаццаць сяброў Оўшэна».

ЗША — Аўстралія, 2001, рэж. Стывэн Содэрбэрг.

Крымінальная камэдыя.

Паўтор культавай камэдыі 60–х гадоў з Фрэнкам Сынатрам. Злодзей Оўшэн плянуе абрабаваць казыно — і арганізуе каманду з 11 сяброў…

Замест Фрэнка Сынатры — Джордж Клуні, кампанію яму складаюць Брэд Піт, Мэт Дэйман і Джулія Робэртс. «Памаранчавы» Ўладзімер Клічко засьвяціўся ў ролі баксэра.

**СТВ, 23.35**

«Дзіўныя сады».

Францыя, 2003, рэж. Жан Бэкер.

Драма.

Чатыры французы схопленыя нацыстамі і пасаджаныя ў яму. Перад расстрэлам ахоўнік выращвае паднясць настрой вязьням і пачынае іх забаўляць. Гэта становіцца пачаткам цудоўнага вызваленьня…

Ролі выконваюць: Жан Вільрэ, Бэнуа Мажымэль, Т'еры Лерміт.

### Нядзеля, 21 траўня

**СТВ, 20.25**

«Любоўная ліхаманка». («Любоўная песьня для Бобі Лонга»).

ЗША, 2004, рэж. Шэйні Габел.

Гераіня вяртаецца ў дом памерлае маці і нечакана знаходзіць там пісьменьніка–алькаголіка зь сябрам–біёграфам…

Пранізьлівы фільм пра жыцьцё, самоту й разуменьне.

Скарлет Ёхансан — гераіня. Сольны трыюмф Джона Траволты ў ролі сьсівелага героя.

**АНТ, 21.05**

«Добрыя хлопцы».

ЗША, 1990, рэж. Марцін Скарсэзэ.

Гангстэрская драма.

Гэнры Хіл усё жыцьцё марыў стаць гангстэрам. Калі мары зьдзейсьніліся, прыйшлося зь імі разьбірацца…

Віртуозная, але халаднаватая рэжысура Скарсэзэ. Сьвет, у якім застаўся толькі страх пакараньня. І урвіс Робэрта Дэ Ніра…

**Андрэй Расінскі**




**...ён быў модникам.**

**...афицыёз захацеў супрацьставіць нешта антылукашысцкаму руху флэш-мобаў.**

— Навіна дня: сёньня ў Піцеры адбыўся флэш-моб «саміт лідэраў саюзнай дзяржавы».




**...існаваў помнік «пачатак усіх дарог беларускіх для невыязных».**




МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ

### Сурвілла наведвае Аўстралію



У праграме візыту старшыні Рады БНР — Сыднэй, Мэльбурн, Адэляйда.
**Старонка 12.**

### Вольга Корбут:



«Бел-чырвона-белы сьцяг — сапраўдны».
**Старонка 12.**

### Шпарагі



Сапраўдныя далікатэсы ў «Нашай страве».
**Старонка 26.**

### «НОМ» зьняў беларусаў




«Беларусь — гэта Быкаў, «Песьняры». А яшчэ звыродлівыя катэджы мытнікаў і нечалавечая працэдура прахаджэньня мытні».
**Старонка 21.**

### Глябальныя выклікі пяцігодкі

Лёлік Ушкін пра дзясятку пагрозаў нацыянальнай бясьпецы.
**Старонка 17.**

## Дзень памяці сьвятой Эўфрасіньні

Грэка-каталіцкі клюб інтэлігенцыі імя Кірылы Тураўскага запрашае на сустрэчу з дасьледчыкам жыцьця Эўфрасіньні Полацкай пісьменьнікам Уладзімерам Арловым, якая адбудзецца ў рамках Дня памяці нябеснай заступніцы Беларусі.

Запрашаем **23 траўня** ў касьцёл Сьв. Яна Хрысьціцеля (вул. Пляханава, 28-а). Пачатак Сьвятой літургіі а 17 гадзіне. Сустрэча а 18.30.

Праезд ад ст. мэтро «Партызанская» ў бок Серабранкі трамваямі №3, 6, 7, 8, тралейбусам №35 да прыпынку «Вуліца Гараўца».

## Запрашаем у падарожжа

28 траўня (нядзеля) па маршруце: Менск—Слуцак—Гразавок—Чыжэвічы—Грозаў—Цімкавічы—Бабоўня—Наднёман—Менск.

11 чэрвеня: Косава—Ружаны—Лыскава—Пружаны—Шарашова—Бяроза.

**292-54-58, 622-57-20, 509-12-16 (Зьміцер)**

## ЖАРТЫ

* * *

На рынку:
— Прабачце, гэта бульба на пасадку?
— Не, знаеце, на ўзьлёт!

* * *

— Ты ясі курыцу? Ты што, не баісься птушынага грыпу?
— Калі яна чхне, я хутчэй пamру ад інфаркту.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Засьц. Плешчавічы. Мінск. губ. Слуцк. пав.** Сёлета, як ад веку вядзецца ў нас, спраўлялі «расу» на Юр'я. Зьбіраліся хлопцы і дзяўчаты ў полі; хлопцы папрыносілі выпіўку, дзяўчаты закуску; гулялі танцы, ігры і карагоды. Праўда, што пры некультурнасьці нашай такія гульні найчасьцей канчаюцца тым, што, падпіўшы, нехта нескім пасварыцца, але ўсё ж ткі гэты прастары абычай варта шанаваць і падтрымліваць, бо мае ён у сабе многа паэзіі.

**Адзінокі**

**Нясьвіж, Мінск. губ. Слуцк. пав.** Як летась, так і сёлета цэлы гэты красавік пагода служыць такая, што ў пяску яйцо сьпячы можна. Суш ударыла, і людзі сквапна выглядаюць дажджу. Адна дзяўчына, хочучы, каб быў дождж, уносіла ў хату серп, але дарма: пагода як была сухой, так і асталася, толькі дзяўчына пераканалася, што забабоны — гэта брахня, створаная цёмнымі людзьмі.

**Т.Трычка.**

**«НН», 1911. №18—19**

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
галоўны рэдактар Андрэй Дынько
фотарэдактар Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2671. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 17.05.2006.
Замова № 2677.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**КВАТЭРА**

**Сьвядомая пара** здыме на працяглы тэрмін 1-2-пакаёвую кватэру. Беларускі парадак і беларускасьць гарантуем. Своечасовая аплата. Т. 394-89-27, kryw.mzr@gmail.com

**КНІГІ**

**«Наша Ніва», «Наша слова»,** кнігі, слоўнікі, энцыкляпэдыі, фільмы ды музыка на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак — пятніца (15.00—19.30)

**Тэрмінова шукаем** фільмы на любых носьбітах: Данчык, «Вяртаньне» Міхася Забэйды і іншыя фільмы пра вядомых беларускіх дзеячаў. За узнагароду! Т.: 649-08-88, 017-249-08-88, w1979@tut.by

**ПРАЦА**

**Прапануем заробак** распаўсюднікам беларускай музыкі. Т.: 649-08-88, 766-24-25, w1979@tut.by. А/с 5, 220085 Менск